№ 37 (682) 6 кастрычніка 2010 www.nn.by

незалежная газета

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



### Што Лукашэнка рабіў у Стамбуле

Старонка 3




### Без медалёў, але самыя прыгожыя

Старонка 6



### Савецкая дачка прэзідэнта БНР

Старонка 12

**Выбар-2010**

• **Ярмошына параўнала Лукашэнку з вязнем.** Пры рэгістрацыі ініцыятыўных групаў пытанні ўзніклі па трох.

• **Лукашэнкаўцы раскрылі тайныя планы апазіцыі.** Рэдактар часопіса «Беларуская думка» апублікаваў сенсацыйны матэрыял.

• **Зміцер Дашкевіч: Не бойцеся рускіх!** Лідар «Маладога фронту» аб прэзідэнцкіх выбарах.

**Старонка 8.**

• **Хто колькі абяцае за подпіс?** Вылучаюцца з агульнага спісу Някляеў і Кастусёў.

• **Ці стане Саннікаў адзіным кандыдатам?** Найбольшыя чэргі — каля пікетаў лідара «Еўрапейскай Беларусі».

• **Някляеў і кот Барсік падпісалі мемарандум.** Лідар «Гавары праўду» прызнаўся, што забіў ката.

• **«Міс Грудзі» ўвайшла ў ініцыятыўныя групы Някляева і Раманчука.** «У зборы подпісаў нам шанцуе».

**Старонка 9.**

• **Кампанія ў стылі a la Russe.** Піша Віталь Сіліцкі.

**Старонка 10.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.

# І зноўку — ты




**Лукашэнкаўскія пікеты ў Мінску не выклікаюць ажыятажу. Старонка 8.**

# «Адносіны не будуць ранейшымі»

Мядзведзеў падвёў рысу пад канфліктам з Аляксандрам Лукашэнкам.

Апошні месяц складалася ўражанне, што інфармацыйная вайна паміж Беларуссю і Расіяй заціхае. Не з'яўлялася новых частак «Хроснага бацькі», не было гучных заяваў кіраўнікоў.

Як высветлілася, гэта было ўсяго толькі зацішша перад бурай. Супярэчнасці ж нідзе не дзеліся, а наадварот, успыхнулі яшчэ мацней.

Пачалося ўсё з таго, што Аляксандр Лукашэнка запрасіў на традыцыйную прэсканферэнцыю расійскіх рэгіянальных журналістаў. Першыя словы кіраўніка Беларусі былі пра тое, што «мы адзін народ».

Можна было падумаць, што Лукашэнка неяк хоча ўлагодзіць канфлікт з Крамлём. Дзе там! Потым яго панесла. Прадстаўнікі пензенскіх і архангельскіх СМІ наслухаліся пра «бязмозглае кіраўніцтва» Расіі.

Лукашэнка адкрыта прызнаўся, што яго «мочаць» людзі Мядзведзева. Каманда Пуціна ж з гэтым згодная. Ён прывёў прыклад, што раней яны гэтак сама мачылі Рахімава, Ілюмжынава, Лужкова.

Дарэчы, што датычыць былога мэра Масквы, то Лукашэнка заявіў, што ён быў і застаецца ягоным сябрам. Беларускі лідар нават гатовы прытуліць Лужкова ў сябе, як раней зрабіў з Бакіевым. Гэта таксама відавочны раздражняльнік для Масквы.

Урэшце Лукашэнка параіў расійскаму кіраўніцтву лепш сачыць за тым, што адбываецца за Уралам.

Пакпіў ён і асабіста з Мядзведзева, што ён не ўмее трымаць рыдлёўку ў руках.

### Мядзведзеў: Лукашэнку варта заняцца расследаваннем спраў зніклых

Натуральна, такія словы Лукашэнкі застацца незаўважанымі ў Расіі не маглі. Адрэагаваў на іх асабіста Дзмітрый Мядзведзеў, які ў нядзелю на сваім відэаблогу звярнуўся зварот наконт Лукашэнкі і Беларусі. Зварот паказалі ўсе расійскія тэлеканалы.

Ужо ў самым пачатку Мядзведзеў параўнаў Лукашэнку з Ючшанкам. Расія ўсяляк ігнаравала ўкраінскага прэзідэнта.

«Перадвыбарная кампанія там цалкам пабудавана на антырасійскіх сюжэтах, на істэрычных абвінавачаннях Расіі ў нежаданні падтрымліваць беларусаў і беларускую эканоміку, праклёны ў адрас расійскага кіраўніцтва. За ўсім гэтым відаць выразнае жаданне пасварыць дзяржавы і, адпаведна, народы», — лічыць расійскі кіраўнік.

**Працяг на старонцы 3.**

# Наркакантроль унёс 48 новых прэпаратаў у спіс забароненых у Беларусі

Тым часам у Польшчы моладзь гіне ад легальных наркотыкаў.

У Польшчы некалькі юнакоў атруціліся легальным аналагам амфетаміну, рэчывам пад назвай «Тайфун». 20-гадовы хлопец памёр.

Польскія дактары паднялі шум: гэты легальны прэпарат уздзейнічае на арганізм гэтак сама, як і «сапраўдныя» наркотыкі, але яго прадавалі абсалютна легальна.

Прэм’ер-міністр Дональд Туск у рэзкай форме выказаўся наконт легальнасці «Тайфуна» і іншых падобных рэчываў. У выніку за выходныя ў Польшчы зачынена больш за тысячу (!) крамаў, што гандлявалі «энергетычнымі», «эйфарычнымі» і «псіхадэлічнымі» рэчывамі.

У Беларусі так званыя «легальныя наркотыкі» забараняюцца па меры іх выяўлення. Некалькі разоў у год выходзіць новы, дапоўнены спіс забароненага.

Але хцівыя прадаўцы ўвесь час знаходзяць выйсце — ствараюць новыя сумесі, якія не ўтрымліваюць нейкага зазначанага ў новым спісе інгрэдыента, і працягваюць гандляваць «сумессю для палення» ці «соллю для ваннаў».

Існуе і шэраг сайтаў, на якіх можна набыць «соль», прычым яе кампаненты насамрэч будуць пакуль што легальнымі ў Беларусі. Назва «солі для ваннаў» прыйшла з Англіі, дзе гэтыя парашкі таксама маюць шырокае хаджэнне.

Анатацыя да «солі» паведамляе, што аднаго грама хапае на 7–8 чалавек і што гэтую соль нельга ўжываць унутрывенна.

Намеснік начальніка Упраўлення па наркакантролі і процідзеянні гандлю людзьмі МУС Васіль Лосіч кажа: «Накont «сумесяў для палення», «соляў для ваннаў» і «падкормкі раслінаў» я вам скажу так: толькі за гэты год мы ўнеслі 48 прэпаратаў у спіс забароненых на тэрыторыі Беларусі. Аднак, калі мы першы раз уносілі папраўкі ў заканадаўства, мы думалі, што назаўжды развітаемся з «легальнымі прэпаратамі» — тады мы налічылі 20 штук. Але праз тры месяцы мы даведаліся, што з’явіліся новыя прэпараты. Пасля новай забароны узніклі новыя наркотыкі. Насамрэч ва ўсім свеце няма магчымасці разам забараніць усё гэта, але мы імкнёмся не адставаць і адсочваць кожны новы прэпарат».

**Юрась Ускоў**


PHOTO.BYMEDIA.NET

**Пакуль на мяжы шукаюць наркотыкі, яны трапляюць у краіну як соль для ваннаў.**

## Сцісла

**• Ацяпленне ў мінскіх кватэрах да канца тыдня не ўключаць.** «Надвор’е не халоднае, энергарэсурсы дарагія», — матывавалі ў Мінгарвыканкаме.

**• Velcom стаў цалкам аўстрыйскім.** Кампанія Telekom Austria Group выкупіла апошнія 30% акцый беларускага аператара сотавай сувязі. Кіпрская SB Telecom Limited па ўмовах кантракта атрымае 335 мільёнаў еўра. Астатнія 70% былі выкупленыя аўстрыйцамі ў кастрычніку 2007 года за 730 млн.

**• Першы снег — у сярэдзіне кастрычніка.** У першай палове месяца, прагназуе Гідраметэацэнтр, будзе стаяць сухое, але халаднаватае надвор’е. Сярэднясутачная тэмпература паветра будзе на 5–6 градусаў ніжэйшая за норму. Уначы на большай частцы тэрыторыі краіны прагназуюцца замаразкі да мінус 5. Тэмпература паветра ў дзённыя гадзіны складзе 8–13 градусаў цяпла. Бліжэй да сярэдзіны месяца з’явіцца воблачнасць, будуць праходзіць дажджы. У сярэдзіне месяца пачне залятаць і першы снег.

**• Сухарэнка вярнуўся ў Мінск.** Цяпер сын былога старшыні КДБ, а зараз — пасла ў Арменіі Сцяпана Сухарэнкі працуе ў МЗС на кіруючай пасадзе. Хаця яшчэ год таму ён займаў пасаду першага сакратара прадстаўніцтва Беларусі пры Радзе Еўропы ў Страсбургу. У МЗС Андрэй Сухарэнка адказвае за дачыненні Рады Еўропы з Беларуссю.

**• П’яны хуліган прымусіў 50-гадовага мінчаніна пакалечыць самога сябе.** 27-гадовы сталяр ТАА «Дзелавы лес» беспрычынна збіў 50-гадовага мінчука, які нідзе не працуе. Пасля пагрозамі змусіў яго скочыць з моста на чыгунку. Пацярпелага даставілі ў бальніцу, хулігана арыштавалі.

**• Праз месяц — прэм’ера скандальнай «Масакры».** Разрэкламаваны беларускі фільм жахаў пакажуць на Мінскім міжнародным кінафестывалі «Лістапад». Фільм Андрэя Кудзіненкі будзе ўдзельнічаць у конкурсным паказе, які пройдзе 5—12 лістапада. Дарэчы, узначаліць журы сёлетняга фестывалю заслужаны артыст Беларусі, дэпутат Генадзь Давыдзька.

**СМ**




# Славацкая надзея для паняволенай нацыі

Arche № 9’2010 прысвечаны Славаччыне.

Чытаючы «славацкі» нумар часопіса, лёгка пераканацца, наколькі каштоўны для нас славацкі досвед. Бо ў гэтай краіне адбываліся падобныя працэсы нацыятворчасці. Славакі, як і беларусы, вымушаны былі адстойваць моўную і культурную адметнасць у атачэнні больш магутных суседзяў.

Славацкі нумар нагадвае класічныя нумары ARCHE пачатку 2000-х: тут крыху эсэістыкі (тэкст Даніэлы Капітанявай пра сужыццё славацкай большасці і венгерскай меншасці), трохі мовазнаўства (Славамір Андрэёвіч «Новы моўны закон у Славакіі»), каліва гісторыі (Любамір Дзюравіч «Наша славацкая ідэнтычнасць…») і шмат літаратуры. Лёгкая эротыка Монікі Кампанікавай, лёгкі сюррэалізм Паўла Вілікоўскага. Цэнтральнае месца ў нумары займае «Кніга пра пагост», іранічны раман пра апошні людскі прытулак (з рысункамі аўтара).

Ёсць і каляровыя коміксы пра Юрая Янашыка, славацкага Робіна Гуда.

Уклаў славацкі нумар багеміст Сяргей Сматрычэнка.

Шукайце часопіс у кнігарнях і ў незалежных распаўсюднікаў.

**КМ, Лявон К**

## Самае чытанае на nn.by за 29 верасня — 5 кастрычніка

- І зноў — ты. Фоты з пікетаў за Аляксандра Лукашэнку
- Ці стане Саннікаў адзіным?
- Лукашэнкаўцы раскрылі тайныя планы апазіцыі
- «Міс Грудзі» ўвайшла ў ініцыятыўныя групы Някляева і Раманчука
- Мядзведзеў: Лукашэнку варта заняцца расследаваннем спраў зніклых людзей
- Хто колькі абяцае за подпіс?
- Гісторыя ў мультфільмах: Польшча і Беларусь
- У школьніка забралі дзённік, запоўнены па-беларуску
- Сіліцкі: Кампанія ў стылі a la Russe
- Ад чаго ў Мінску масава гінуць галубы?

## nn@nn.by

### Ці з’явіцца вуліца Грунвальдская ў Полацку?

У красавіку сябры суполкі «Рубон» Навапалацкай гарадской арганізацыі Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны накіравалі ў Полацкі гарвыканкам і гарсавет каля 200 подпісаў у падтрымку прапановы надаць адной з полацкіх вуліцаў назву «Грунвальдская».

Акрамя гэтага, ідэю падтрымалі ў інтэрнэце..

У выніку Полацкі гарвыканкам палічыў мэтазгодным надаць адной з праектаваных вуліцаў горада назву «Грунвальдская» і будзе ўносіць гэтую прапанову на разгляд сесіі гарсавета ў у верасні.

**Зміцер Шчэрбік, Навапалацк**

# Не ўсё ў жыцці апошні раз!

## Падпіска праз Рэдакцыю

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае 7500 рублёў.

Мы рэкамендуем падпісвацца праз Рэдакцыю.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Каб штотыдзень атрымліваць газету, дасылайце адрасы і грошы за газету.

1) Просім усіх ахвотных падпісацца паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз: тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад’езда.

**Банкаўскія рэквізіты (змяніліся з 1 мая):**

ПВУП «Суродзічы», УНП 190 786 828

Адрз. № 539 ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Мінск, код 739

Рахунак атрымальніка: 3012 740 628 011

Від аплаты: За газету «Наша Ніва»

## Падпіска праз «Белпошту»

Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — 63125, для прадпрыемстваў — 631252. Падпісацца можна на кожнай пошце.

## Дзякуй падпісчыкам,

якія падпісваюцца праз Рэдакцыю

Андрусю А. з Мінскага раёна.
Н.К. са Светлагорскага раёна.
Івану С. з Дзятлаўскага раёна.
Валянціне А. з Талачынскага раёна.
Галіне Г. з Барысаўскага раёна.
Алене С. з Магілёва.
Сяргею С. з Баранавіцкага раёна.
Івану З. з Пружанскага раёна.
Вадзіму Ш., Людміле П. з Брэста.
В.М. з Лепельскага раёна.

# «Адносіны не будуць ранейшымі»

Працяг са старонкі 1.

«Прэзідэнт Лукашэнка ў сваіх выказваннях выходзіць далёка за рамкі не толькі дыпламатычных правілаў, але і элементарных чалавечых прыстойнасцяў. Я памятаю, як я быў здзіўлены, калі пры нашай першай двухбаковай сустрэчы, замест таго каб засяродзіцца на расійска-беларускім супрацоўніцтве, ён вельмі падрабязна і выключна ў негатыўнай манеры пачаў абмяркоўваць маіх папярэднікаў на пасадзе прэзідэнта Расіі — Барыса Ельцына і Уладзіміра Пуціна», — зазначыў іх наступнік.

«Лукашэнку трэ было б займацца ўнутранымі праблемамі. У тым ліку, нарэшце, расследаваць шматлікія справы аб знікненні людзей. Расіі, як і іншым краінам, гэта неабыякава», — заявіў Мядзведзеў.

«Расія гатовая да развіцця саюзніцкіх адносін з Беларуссю. Больш таго, хто б ні кіраваў Расіяй і Беларуссю, нашы народы назаўжды застануцца брацкімі. Мы хочам, каб нашы грамадзяне жылі не ў страху, а ў атмасферы свабоды, дэмакратыі і справядлівасці», — падвёў вынік Д.Мядзведзеў.

### Някляеў: Крэмль заявіў пра тое, што ён гатовы дамаўляцца з кім заўгодна

«Галоўная думка паслання — немагчымасць далейшага супрацоўніцтва з Лукашэнкам. Па сутнасці, Мядзведзеў назваў Лукашэнку ганебным і вераломным чалавекам. У былыя часы такія абвінавачванні заканчваліся дуэлямі. Фактычна, Крэмль заявіў пра тое, што ён гатовы дамаўляцца з кім заўгодна, толькі не з дзеючым цяпер прэзідэнтам», — выказаўся лідар кампаніі «Гавары праўду» Уладзімір Някляеў.

### Зайшлі ў тупік

«Апошнім часам адносіны з беларускім кіраўніцтвам яўна зайшлі ў тупік. З улікам тых каментароў, якія даў прэзідэнт Беларусі, гэтыя адносіны не будуць ранейшымі», — растлумачыла сэнс словаў Мядзведзева яго ная прэс-сакратарка Наталля Цімакова.

Што ж можа абазначаць гэтае «ніколі»? Найбольш імаверныя сцэнары, якія бачацца, — непрызнанне Расіяй прэзідэнцкіх выбараў і абвяшчэнне Лукашэнкі нелегітымным прэзідэнтам. Пра гэта ўжо намякала старшыня Цэнтрвыбаркама Лідзія Ярмошына.

Таксама могуць быць пытанні ў пастаўках энерганосьбітаў. Што больш ніколі Беларусь не будзе мець льготных цэнаў на газ і нафту. Ці крытычна гэта для беларускай эканомікі? Бадай не. Але засцярогі цягнуць паясы давядзецца.

**Зміцер Панкавец**

**Колькі каштаваў беларускім падаткаплатнікам візіт расійскіх журналістаў?**

102 расійскім журналістам аплацілі дарогу ў Мінск і назад, а таксама пражыванне ў гатэлі «Планета». Журналістаў размясцілі ў нумарах бізнэс-класа коштам 100 долараў у суткі. Цягам трох дзён іх вазілі на экскурсіі. На самой прэс-канферэнцыі іх чакалі пакеты з падарункамі і сувенірамі.

Калі параўнаць візіт маленькай групы беларускіх журналістаў да прэзідэнта Дзмітрыя Мядзведзева, то расійскім падаткаплатнікам гэта нічога не каштавала. Дарогу рэдактары беларускіх СМІ аплачвалі самі. А з боку адміністрацыі кіраўніка Расійскай Федэрацыі журналістам прапанавалі чай і кавы.

## Дзмітрый Крук: Для эканомікі гэта не смяротна

Эканаміст Дзмітрый Крук пра магчымыя наступствы адмены Расіяй ільготаў на нафту і газ.

**ДК:** Увядзенне мыта на нафту прывядзе да дадатковага дэфіцыту замежнага гандлю ў памеры 1,5 мільярда даляраў. Калі льготы на газ таксама будуць ліквідаваныя, то гэта прывядзе да дэфіцыту яшчэ ў 500—700 мільёнаў даляраў. Натуральна, што гэта дасць негатыўны ўплыў на бюджэт.

**«НН»: Наколькі небяспечна гэта для беларускай эканомікі?**

**ДК:** Гэта не смяротна для яе. Відавочна, што зараз прыярытэтам павінна стаць палітыка энергаэфектыўнасці. Здаецца, што беларускі ўрад недастаткова эфектыўна працуе ў гэтым кірунку. Канечне, спатрэбіцца больш доўгатэрміновая праграма рэформаў у замежнай палітыцы і эканоміцы.

**«НН»: Беларусам варта чакаць павышэння цэнаў за кватэрплату?**

**ДК:** Безумоўна, так. Незалежна ад таго, якія цэны ўсталюе Расія на энерганосьбіты. Сёлета мы назіралі заніжаныя цэны. Натуральна, што павышэнне можа прывесці і да змяншэння заробкаў, найперш у бюджэтнікаў.

**Гутарыў ЗП**

## НТВ будзе тры дні паўтараць «Хроснага бацьку»

Пра гэта паведамілі ў праграме «Надзвычайнае здарэнне». Тыя, хто глядзіць НТВ праз спадарожнік, змогуць пабачыць фільмы ў аўторак, сераду і чацвер.

## З ПОШТЫ РЭДАКЦЫІ

### НТВ? Парнаграфія!

**Вось ужо амаль месяц я працую ў якасці маладога спецыяліста ў адной з гімназій Магілёва.** Пра ўмовы майго дагавора і ўмовы маёй працы здагадацца няцяжка. Хацела распавесці пра іншае.

Нядаўна была на нарадзе, прысвечанай вызначэнню вынікаў (зразумела, станоўчых) адыходзячай пяцігодкі. Дырэктарка шмат часу пяяла пра расквітнелыя гарады і вёскі, рост заробкаў ды інш. А потым… пачала скардзіцца на тэлебачанне, якое заклікае падлеткаў да гвалту і парнаграфіі. Здагадайцеся, які канал яна прывяла ў прыклад? Правільна, НТВ.

Цікава, у дырэктарак загад такі ці гэта ўласная ініцыятыва?

**Журавіна, Магілёў**

# «Лукашэнку сустрэў памочнік губернатара Стамбула»

Турэцкія СМІ — пра візіт (ці адпачынак?) кіраўніка Беларусі.



Большасць турэцкіх газет праінфармавалі пра візіт Лукашэнкі, перадрукаваўшы нататку дзяржаўнага інфармагенцтва Anadolu Ajansı.

«Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыбыў у Турэччыну. Лукашэнка прыляцеў на асабістым самалёце. У дзяржаўнай гасцініцы аэрапорта імя Атацюрка яго сустрэў памочнік губернатара Стамбула Джэлялетдзін Юксэль і іншыя зацікаўленыя асобы. Крыху перадыхнуўшы ў дзяржаўнай гасцініцы, Лукашэнка праз нейкі час паехаў з аэрапорта. Між іншым, разам з прэзідэнтам Лукашэнкам у Стамбул прыбыў таксама яго сын Мікалай Лукашэнка. 6-гадовы Мікалай Лукашэнка, што спусціўся па трапе разам з бацькам, цярпліва чакаў побач з целаахоўнікамі выхаду свайго бацькі з залы прыёму гасцей дзяржаўнай гасцініцы і, разам з татам сеўшы ў адну службовую машыну, з'ехаў з аэрапорта. Лукашэнка мае прыбыць на вячэру да прэзідэнта Абдулы Гюля ў яго най стамбульскай рэзідэнцыі «Тараб'я Кёшкю», а таксама сустрэнецца з прэм'ер-міністрам Таіпам Эрдаганам у стамбульскім бюро прэм'ер-міністра».

Некаторыя выданні, перадрукоўваючы гэтую навіну, падкрэслілі ў загалоўках, што «Беларускі прэзідэнт прыехаў у Турэччыну з сынам» ды змясцілі вельмі мілыя здымкі Лукашэнкі і сына — такіх не відаць у беларускіх выданнях, — на якіх, праўда, абвялі хлопчыка кружком.

Каб павячэраць з беларускім кіраўніком, турэцкі прэзідэнт, праўдападобна, прыехаў са сталіцы, Анкары. Сайт прэзідэнта Турэччыны стрымана паведаміў пра вячэру — двума сказамі і трыма зіхоткімі здымкамі. «Прэзідэнт Абдула Гюль павячэраў з прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам у рэзідэнцыі «Тараб'я Кёшкю». Пасля вячэры прэзідэнт Гюль адбыў са Стамбула ў Анкару».

Калі мэта прыезду ў Турцыю — працоўны візіт, дык чаму Лукашэнка прыляцеў у Стамбул, а не ў сталіцу Анкару? Калі ж гэта прыезд на адпачынак, спалучаны з парай працоўных сустрэч, чаму пра гэта не паведамляецца?

Ці ў Аляксандра Лукашэнкі была нейкая справа ў Турцыі, якая вымагала асабістага прыезду, але не было магчымасці аформіць яе ў рамках афіцыйнага візіту, бо Анкара не хацела дасылаць афіцыйнага запрашэння з прычыны таго, што трымаецца агульнаеўрапейскай пазіцыі ў замежнай палітыцы?

А можа, гэта была візантыйская дэманстрацыя Маскве — я спакойны, я абсалютна спакойны? Не кожны кіраўнік краіны можа дазволіць сабе такі выезд у часе выбарчай кампаніі.

На гэтыя пытанні адказаў у турэцкай прэсе не знаходзім. Турэцкія СМІ ўвогуле мала зацікавіліся гэтым візітам.

Адсутнасць інфармацыі пра прычыны і абставіны візіту Лукашэнкі ў афіцыйных СМІ спарадзіла фантастычныя чуткі, што такім спосабам кіраўнік дзяржавы пераправіў у Турцыю былога прэзідэнта Кіргізіі Курманбека Бакіева.

Пра адпачынак беларускага кіраўніка турэцкія выданні пакуль нічога не паведамляюць. Пра тое, ці выязджаў Лукашэнка ў Турцыю на адпачынак, можна будзе меркаваць толькі па працягласці яго нага перабывання там.

**Сяргей Богдан**

## Сцісла

**• Карпуцю далі два гады.** Былы старшыня Гродзенскага аблсавета дэпутатаў, член савета рэспублікі нацыянальнага сходу Беларусі Аркадзь Карпуць асуджаны на два гады пазбаўлення волі. Ён прызнаны вінаватым у падрыхтоўцы да давання хабару ў буйным памеры.

**• Лукашэнка вярнуў Дамашкевіча з нябыту.** Былы старшыня Мінскага аблвыканкама і кіраўнік Кіраўніцтва справаў прэзідэнта Мікалай Дамашкевіч прызначаны памочнікам Лукашэнкі па Віцебскай вобласці.

**• З'езд БСДП.** 10 кастрычніка пройдзе чарговы з'езд Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі. За пасаду старшыні будуць змагацца прабеларускае і прарасійскае крылы ў партыі. Першае вылучыла гісторыка Анатоля Сідарэвіча, другое — генерала Валерыя Фралова.

**• Актывіст БХД галадаў дзесяць сутак.** Выйшаў на волю Канстанцін Жукоўскі — гомельскі каардынатар аргкамітэта па стварэнні партыі Беларуская хрысціянская дэмакратыя. Дзесяць дзён арышту ён трымаў галадоўку ў знак пратэсту супраць рашэння суда. На фестывалі «Кліч Палесся» ў Ляскавічах апазіцыянер быў затрыманы міліцыяй, збіты невядомымі да страсення мозгу. Але міліцыя склала пратакол, што ён нібыта лаяўся матам. На судзе сведчылі супрацоўнікі АМАПа, якія, кажа Жукоўскі, яго і збівалі.

**ЗП**

# Заробкі падрастуць. Але толькі на два месяцы?

«Гэта каласальна складаная задача», — заявіў міністр фінансаў.

Пастановай Савета міністраў ад 27 верасня 2010 года тарыфная стаўка першага разраду павышаецца з 90 тысяч да 118 тысяч рублёў. Рост склаў 31%! Гэта значыцца, што аклады бюджэтнікаў павялічацца на траціну.

Узняты і мінімальны заробак. У адпаведнасці з прэзідэнцкім указам, нельга плаціць работнікам менш за 400 тысяч рублёў. Раней усталяваны мінімум складаў 258 тысяч.

Праўда, змены падзейнічаюць толькі з 1 лістапада. Дзіўна, бо звычайна пастановы пра павелічэнне выплат, якіх бы ні было — стыпендый, пенсій і іншых — прымаюцца задняй датай. Цяпер урад, здаецца, не спяшаецца павышаць заробкі. Чаму?

Зразумела, што рашэнне носіць не эканамічны, а палітычны характар. Для эканомікі гэта ўдар, мяркуюць незалежныя эканамісты. Неадназначнасць рашэння падкрэсліў нават міністр фінансаў Беларусі. «Павысіць заробкі перад выбарамі — складана», — прызнаў Андрэй Харкавец. Але галоўная праблема не ў тым, каб падняць заробкі на такі ўзровень, а ў тым, каб утрымаць іх. «Гэта каласальна складаная задача», — заявіў міністр. Цяперашняе павышэнне з'яўляецца самым істотным за апошнія гады. Па ранейшых падліках, яно запатрабуе дадаткова каля $2,5 мільярда і павелічэння дэфіцыту бюджэту да 3,0% ВУП.

**Плюсы неапраўданага павелічэння заробкаў**

Псіхалагічнае адчуванне, што зарабляеш больш.

Прынцып «мужык сказаў — мужык зрабіў». Заробак сапраўды набліжаецца да $500.

**Мінусы неапраўданага павелічэння заробкаў**

Штучны рост заробкаў імгненна з'ядаецца інфляцыяй — ростам цэн

Чаканая інфляцыя кампенсуецца стаўкай рэфінансавання, якую Нацбанк апускае ўсімі магчымымі высілкамі. Цяпер прыйдзецца паднімаць?

Дэфіцыт бюджэту, патрэба прыцягнення новых крэдытаў

Імідж ненадзейнай краіны — патрабаванні МВФ не выконваюцца

### МВФ супраць

Міжнародны валютны фонд не стаў гуляць у дыпламатыю: «Мы не бачым эканамічных падстаў для гэткага значнага росту заробку. Рост заробкаў павінен адпавядаць росту прадукцыйнасці працы. Мне незразумела, чым тлумачыцца такое істотнае павышэнне, — заявіла прадстаўніца МВФ у Беларусі Наталля Калядзіна. — Павелічэнне заробкаў прывядзе да росту ўнутранага попыту і росту попыту на імпартныя тавары і паслугі. Гэта азначае пашырэнне дэфіцыту бюджэту і змяненне структуры выдаткаў бюджэту. Урад не зможа знізіць падатковую нагрузку. У рамках праграмы прадугледжваўся пэўны рост заробкаў і пенсій, аднак такое значнае падвышэнне не адпавядае нашым дамоўленасцям».

У наступным месяцы ў Беларусь прыедзе чарговая місія МВФ. Калі бюджэтны дэфіцыт павялічыцца істотна, прыйдзецца зноў прасіць дапамогі ў фонду. Вось толькі ці павераць яны цяпер чарговым абяцанкам беларускай улады?

**Параўнанне «навагодніх» заробкаў.**

| Год | Заробак у снежні, $ | Заробак у студзені, $ | Мінус, $ |
|---|---|---|---|
| 2005–2006 | 261 | 241 | 20 |
| 2006–2007 | 312 | 288 | 24 |
| 2007–2008 | 369 | 352 | 17 |
| 2008–2009 | 456 | 347 | 109 |
| 2009–2010 | 385 | 350 | 35 |

### Несапраўдныя $500

Зрэшты, даводзіць заробак да $500 для ўрада зусім неабавязкова. Паколькі выбары прызначаныя на снежань, за мэту можна разумець сярэдні лістападаўскі заробак у раёне $460—470. Тады абяцанне давесці паказчык да $500 можна і не выконваць.

Досвед апошніх гадоў паказвае, што заробак у канцы года большы за той, што будзе налічаны ў пачатку наступнага года. Прычына таму — шматлікія прэміі і бонусы па выніках фінансавага года, іх адсутнасць у пачатку наступнага года. Прыведзеная табліца паказвае, што сярэдні памер такога «зніжэння» складае каля $25, нават калі не ўлічваць дэвальвацыйны шок пачатку 2009 года. Значыцца, атрымаўшы перадНавагоднія $470, можна разлічваць максімум на $440—445 у пачатку 2011 года.

**Яўген Васількоў**

# Еўра зноў вышэй за 4000 рублёў

Але для дзяржавы галоўнае — не чапаць даляр.

35 рублёў за дзень, 60 рублёў за дзень — такімі хвалямі ўздымалася еўрапейская валюта за апошнія два тыдні. Цяперашні курс — 4130 рублёў і 1,37 у дачыненні да даляра — далёка не рэкорд, але моцны ўдар па пазіцыях еўраскептыкаў, якія яшчэ нядаўна прагназавалі роўнасць еўра і даляра.

Самай небяспечнай пазіцыяй у еўразоне стала Ірландыя. Зразумела, стан Грэцыі па-ранейшаму застаецца крытычным, але цяпер праблемы абвастрыліся і на востраве. На выратаванне банкаўскай сістэмы краіне прыйдзецца выдаткаваць 50 мільярдаў еўра. Гэта амаль траціна ВУП краіны. Бюджэтны дэфіцыт Ірландыі вырасце да 32% ВУП і тым самым усталюе антырэкорд за часы існавання еўра.



Сяргей Чалы.

Незалежны эканаміст Сяргей Чалы летам прадказваў рэзкі рост еўра, калі гэтая валюта была на самым нізкім узроўні за апошнія шэсць гадоў. Тады яна ацэньвалася ў 1,2 даляра. Ягоны нечаканы прагноз — 1 еўра як 1,37 даляра — спраўдзіўся, хоць і з невялікім спазненнем. «Наша Ніва» запыталася ў эканаміста, што будзе з еўра далей?

**СЧ:** Думаю, што еўрапейскай валюце ўжо мала засталося расці, — мяркуе Сяргей Чалы. — Але гэта ў адносінах да даляра, у дачыненні да рубля ён можа і паднімацца. Як зменіцца курс еўра ў рублях, калі еўра пачне зніжацца да даляра, — невідавочнае пытанне. У прынцыпе, Нацбанк можа замацаваць еўра і дазволіць расці даляру, але раней так ніколі не рабілі.



**«НН»: Ніякай прывязкі да еўра ў агітацыйных разліках «$500 — кожнаму беларусу» няма. Таму яго курс зараз для ўлады як быццам бы асабліва і няважны?**

**СЧ:** Сапраўды, еўра цікавіць Нацбанк у меншай ступені. У нас заўсёды спачатку ўстанаўліваюць даляр. Нават на сайце Нацбанка афіцыйны курс даляра заўсёды ўказваецца ў цэлых рублях, без дзясятых і сотых.

Сапраўды, курс даляра за апошнія паўгода фактычна не змяняецца. Плюс-мінус 50 рублёў — вось і ўсе ваганні. А еўра скача з агню ды ў полымя. Гэта дае насельніцтву шанец зарабіць невялікія сумы на своечасовым абмене валют, але не ўплывае прынцыпова на асноўны фінансавы курс. Ён арыентаваны на даляр, а дакладней на магічную лічбу «500». Псіхалагічная залежнасць беларусаў ад даляра толькі на руку дзяржаве, якая атрымлівае магчымасць хаваць рэальную эканамічную сітуацыю.

**Яўген Васількоў**

## Сцісла

**• «Газпром»: Газ для Беларусі будзе каштаваць $220 за тысячу кубаметраў.** Гэта будзе сярэднегадавая цана. Сёлета сярэднегадавая цана за газ для Беларусі складае $185. Паніжальны каэфіцыент да кантрактнай цаны на газ для Беларусі адмяняецца з наступнага года.

**• Павел Калавур узначаліць ААТ «Белзнешэканамбанк».** Раней фінансіст займаў пасаду першага намесніка старшыні праўлення Нацыянальнага банка.

**• У Кітаі прадаюць самы дарагі ў свеце ружовы дыямент.** Арганізатары аўкцыёну спадзяюцца атрымаць за яго $20 мільёнаў. Рэкордны ружовы дыямент важыць 14,23 карата.

**• Дзярждоўг Беларусі вырас на 21,6% за 8 месяцаў.** Дзярждоўг Беларусі на 1 верасня 2010 склаў 37,26 трыльёна рублёў — больш за $12 мільярдаў.

**• Кошт паркоўкі ў цэнтры Мінска паднімуць у 10 разоў.** Да канца 2013 года ў Цэнтральным раёне сталіцы будуць пабудаваныя два новыя паркінгі — на Кастрычніцкай плошчы і каля стадыёна «Дынама». Кошт гадзіны паркоўкі ў іх будзе значна вышэйшым, чым у астатніх частках горада.

**• Тарыфы на паслугі ЖКГ застаюцца ранейшымі.** Іх павышэнне да канца года не плануецца. Такім чынам, за ацяпленне беларусы будуць плаціць па старых тарыфах. Паводле афіцыйных падлікаў, беларусы аплачваюць усяго 30% страт на ЖКГ-паслугі.

**• У Мінску за кітайскія грошы пабудуюць «Чайна-Таўн».** Для пабудовы комплексу прапануецца зямельны ўчастак плошчай 17 гектараў у квартале вуліц Аранскай—Маякоўскага—Дзянісаўскай. Будаўніцтва можа пачацца ў 2011 годзе. Для гэтага будзе запрошана кітайская кампанія Harbin Manhattan Multi-Line Group Co, Ltd.

**• «Хайнекен» больш не «Сябар».** Піваварная кампанія «Сябар» змяніла назву, канчаткова адмовіўшыся ад беларускамоўнага брэнда. Раней быў спынены выпуск піва «Сябар». Бабруйскі завод належыць нідэрландскаму канцэрну Heineken.

**• Літоўцы гатовыя інвеставаць 20 млн еўра ў сетку крамаў на Гродзеншчыне.** Будаўнічыя гіпермаркеты «ОМА» з'явяцца ў абласным цэнтры і некаторых буйных гарадах вобласці, у прыватнасці, у Лідзе. Сёлета найбуйнейшая крама такога кшталту адкрылася ў Мінску.

**ЯВ**

# Міндукацыі блаславіла школьную шараварку

**У вясковых школах традыцыя выкарыстання дзіцячай працы не перапынялася, а ў гарадскія школы яна можа вярнуцца.**

У вёсках школьнікі па-ранейшаму капаюць бульбу ў гаспадарках. А дзе-нідзе ў райцэнтрах Гродзеншчыны вяртаецца практыка збору металалому.

«Штогод вучні і настаўнікі вучэбна-педагагічнага комплексу «Крупілавіцкі дзіцячы сад — агульнаадукацыйная сярэдняя школа» Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці дапамагаюць СВК «Граніт-Агра» ва ўборцы бульбы. Такім чынам школа нарыхтоўвае для сябе бульбу, а для школьнікаў гэта магчымасць зарабіць грошы».

Здавалася б, звычайнае для сучаснай Беларусі паведамленне, аднак колькі ў ім тоіцца пытанняў. Папершае, гэтае паведамленне разам са здымкам школьніка з кошыкам бульбы размясціла на першай паласе «Настаўніцкая газета», друкаваны орган Міністэрства адукацыі. Установы, якая, між іншым, найперш мае дбаць пра якасць адукацыі, забяспечыўшы навучальныя ўстановы ўсім неабходным. Выглядае, што «НГ» не бачыць нічога заганнага ў тым, што ў век інтэрнэту і мабільнай сувязі дзеці мусяць капаць для школьнай сталоўкі бульбу, а не засвойваюць навучальную праграму. Насамрэч — у чым праблема? Для іх жа гэта яшчэ і «магчымасць зарабіць грошы».

Наступнае пытанне: ці павінна вясковая школа нарыхтоўваць сабе харч на зіму? І гэта ў «моцнай і квітнеючай краіне». (Ізноў-такі, не забываем пра выкарыстанне працы непаўналетніх з адрывам ад навучальнага працэсу.) І як гэта гарадскія школы без гэтага абыходзяцца? Нехта скажа, што вясковыя дзеці пры гэтым маюць ільготы пры паступленні. Аднак цяжка паверыць у тое, што адрыў ад вучобы на месяц-два ўвосень ды заведама заніжаны бал пры паступленні – гэта правільная камбінацыя.

Калі ў вясковых школах традыцыя выкарыстання дзіцячай працы і не перапынялася, то ў гарадскія школы яна можа вярнуцца. У Ваўкавыску кажуць пра аднаўленне практыкі збору школьнікамі металалому. Нават прыблізныя лічбы працоўных нормаў агучваюцца — каля тоны з аднаго класа.

Пытанне пра тое, чаму збіраць ураджай, як і за саветамі, дапамагаюць дзеці, вартае асобнай тэмы. Калі ж разглядаць яго з пункту гледжання сучаснага стану вясковай школы, то ўзнікае думка: ці не сведчыць падобная «штогадовая дапамога» пра залежнасць апошняй ад калгаса як ад адзінага спонсара.

Спытайце любога вясковага настаўніка, ці прамяняў бы ён утульны кабінет на працу ў адкрытым полі ў кастрычніку, калі б на тое была яго ўласная воля.

Але ж калгас і аўтобус дае, і гароднінай дапамагае, дый шмат у каго родныя ў СВК працуюць па кантрактах... Адсюль замкнёнае кола, разарваць якое ў стане толькі дзяржава. Але і яе, па ўсім відаць, існы стан рэчаў задавальняе. Чаго вартыя выказванні намесніка міністра адукацыі Казіміра Фарыно пра тое, што сельгасработы не адабʼюцца на якасці навучання старшакласнікаў і студэнтаў. А дарма, бо гэтым самым не толькі закладаецца міна запаволенага дзеяння пад будучыню вёскі.

Узаконены прыгон — не толькі адна з прычынаў уцёкаў моладзі у горад, але яшчэ ён робіць марнымі ўсе спробы павысіць якасць адукацыі вясковага жыхарства.

**Сямён Печанко**



PROSTO-FREE.LIVEJOURNAL.COM

### ІНШЫ ПОГЛЯД

## «Калі б не праца з дзяцінства, сучасны светператварыў бы мяне ў гультайку»

Пісьменніца Наталка Бабіна, маці траіх дзяцей, лічыць, што праца з маленства гартуе дух. Гэта не адпачынак і не забаўка, гэта цяжка і часам пад прымусам, але такім чынам гартуецца моцны характар. «У нашай сямʼі дзяцей з малых гадоў прывучалі да працы. Калі б не гэта, то сучасны свет ператварыў бы мяне ў гультайку». Пісьменніца кажа, што сёння праца школьнікаў у калгасах і сапраўды выглядае дзікавата, але пры гэтым сучаснае жыццё не прапануе ясных нормаў, як навучыць дзяцей працаваць. У любым выпадку, Наталка Бабіна ўпэўненая, што працоўным выхаваннем найперш мусіць займацца сямʼя, а не дзяржава.

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні. З прычыны вялікага абʼёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адраса. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**

# Навошта Лукашэнка сустрэўся з «чалавекам Дзярждэпартамента ЗША»

**Візіт да Канстанцінопальскага патрыярха: шлях да аўтакефаліі ці шантаж Крамля? Піша Анатоль Сідарэвіч.**

Сродкі масавай інфармацыі асвятляюць паездку (не візіт, а менавіта паездку) Аляксандра Лукашэнкі ў Стамбул і яго сустрэчы з турэцкімі афіцыйнымі асобамі. І неяк у цені застаецца аўдыенцыя, якую даў Лукашэнку Усяленскі Патрыярх Варфаламей у сябе на Фанары.

Сустрэча кіраўніка Беларусі з Патрыярхам Варфаламеем не можа не зацікавіць Патрыярха Кірыла і яго атачэнне.

У свой час нервовую рэакцыю ў Маскоўскім Патрыярхаце выклікалі кантакты Варфаламея і прэзідэнта Украіны Віктара Юшчанкі. Прыезд улетку 2008 г. Усяленскага Патрыярха ў Кіеў змусіў падаць туды і цяжкахворага Патрыярха Аляксія ІІ. А перад Патрыярхам у Кіеў паляцеў тадышні «міністр замежных спраў» РПЦ мітрапаліт Кірыл. Мала таго, увосень 2008 г. стары і хворы Аляксій мусіў ехаць і ў Канстанцінопаль на сустрэчу прадстаўнікоў праваслаўных цэркваў ды іх прадстаўнікоў. Лічыцца, што сваёй украінскай палітыкай Патрыярх Варфаламей скараціў жыццё Патрыярху Аляксію.

Галава РПЦ мусіў здзяйсняць шкодныя для яго здароўя пералёты, каб запабегчы пераходу хоць адной з украінскіх цэркваў (а іх, самых вялікіх, тры) пад амафор архіепіскапа Новага Рыма.

Помніцца, у 2008 г. знерваваны мітрапаліт Кірыл назваў Патрыярха Варфаламея «чалавекам Дзяржаўнага дэпартмента ЗША». І прагаварыўся, што РПЦ мае на Фанары сваіх інфарматараў. (Такі вось дух адносін цэркваў-сясцёр.)

Думаецца, што контрвыведка Варфаламея «вылічыла» тых інфарматараў. А калі вылічыла, то змест гутаркі Усяленскага Патрыярха і кіраўніка Беларусі будзе для прадстаўніка РПЦ галаваломкаю.

Само сабою, візіт А. Лукашэнкі на Фанар разлічаны на праваслаўных выбаршчыкаў Беларусі, але ў святле цяперашніх адносінаў паміж Мінскам і Масквою магчыма ўсякае. Нельга выключаць таго, што А. Лукашэнка сказаў ці намякнуў Варфаламею пра магчымасць пераходу Беларускага Экзархата РПЦ пад амафор Усяленскага Патрыярха.

Была ж перад Берасцейскаю уніяй Кіеўская мітраполія, у якую ўваходзілі і беларускалітоўскія землі, Экзархатам Канстанцінопальскай Царквы...

У РПЦ ведаюць, што сярод праваслаўнага духавенства Беларусі ёсць нямала непрыхільных да Масквы. Экзарх Філарэт ужо немалады. І духавенства, і мінская ўлада не могуць не задумацца: а хто будзе наступным Экзархам? І ці абавязкова павінен гэты Экзарх прадстаўляць у Беларусі прадстаўніка РПЦ? Ці не лепш было б, калі б ён стаў намеснікам Усяленскага Патрыярха?

Такія пытанні, паўтараю, не могуць не паўставаць і перад немалою часткаю духавенства, і перад дзяржаўнымі інстытутамі Беларусі, ад якіх у значнай ступені залежыць, каго прыняць у якасці Экзарха і ў якасці чыйго Экзарха.

Гэтую аўдыенцыю можна разглядаць і з іншага пункта гледжання. Можна меркаваць, што А. Лукашэнка хоча ўчыніць ціск на Крэмль і дамагчыся прэферэнцый праз Патрыярха Кірыла.

Прыём кіраўніка Беларусі Патрыярхам Варфаламеем не мог не выклікаць занепакоенасці ў Маскве. Патрыярху Кірылу не трэба, каб да ўкраінскай, малдаўскай ды іншых праблем дадалася і праблема беларуская. Вось на гэтым, праўдападобна, і грунтуецца разлік А. Лукашэнкі.



## Інстытут гісторыі застаўся без дырэктара

**Яго былы кіраўнік Аляксандр Каваленя пайшоў на павышэнне.**

У Інстытуце гісторыі Акадэміі навук паведамілі, што Аляксандр Каваленя цяпер узначальвае Аддзяленне гуманітарных навук і мастацтва НАНБ. Аддзяленне курыруе працу шэрагу навукова-даследчых устаноў, у тым ліку і Інстытута гісторыі.

Выканаўцам абавязкаў дырэктара Інстытута прызначаны Вячаслаў Даніловіч.

Адзін з супрацоўнікаў установы паведаміў, што асоба Даніловіча прымальная для навукоўцаў у якасці дырэктара. Але яго наўрад ці зацвердзяць, бо ён даволі малады ды з'яўляецца толькі кандыдатам гістарычных навук. Хто цяпер узначаліць Інстытут гісторыі? Невядома. Але гісторыкі ўпэўненыя, што правесці выбары дырэктара, як рабілася некалі, ім не дазволяць.

Падчас працы на пасадзе дырэктара Інстытута гісторыі Аляксандр Каваленя адзначыўся звальненнем шэрагу навукоўцаў. Працу страцілі Генадзь Сагановіч, Сяргей Тарасаў, быў змушаны сысці Яўген Анішчанка і іншыя.

**Кастусь Матушыч**

# Без медалёў, але самыя лепшыя і прыгожыя

**У баскетбалістак зборнай зноў закахалася палова краіны.**

Усё ж як несправядліва, што ўся спартовая ўвага ў нашай у краіне аддаецца футболу і хакею. Міма праходзяць выдатныя поспехі гімнастаў ці весляроў. Але асабліва востра адчуваеш гэтую несправядлівасць на фоне жаночай зборнай па баскетболе.

Пра «Буяльскіх дзяўчат» пачынаюць успамінаць толькі падчас буйных спаборніцтваў. У міжсезонны час нашы прыгажуні абдзеленыя ўвагай. Хоць яны і стараюцца падаграваць да сябе інтарэс. Нават для эратычнага календара зняліся.

Вось і на гэты раз перад чэмпіянатам свету ўвагі баскетбалісткам было мінімум. Спартовыя газеты сачылі за мінскім «Дынама» ў КХЛ, за БАТЭ ў Лізе Еўропы. А вось падрыхтоўцы дзяўчат выдзялялася незаўважнае месца на задніх палосах прэсы.

Можа, усё гэта таму, што падсвядома нам здавалася: ранейшыя поспехі баскетбалістак выпадковыя, а вось на наступным першынстве ўсё стане на свае месцы.

Але пасля «бронзы» на Еўропе трохгадовай даўніны быў выхад у васьмёрку мацнейшых на Алімпіядзе, чацвёртае месца летась у Латвіі. І вось зноў выхад у паўфінал на сёлетнім чэмпіянаце свету!

Такой стабільнасці не было яшчэ ні ў адной беларускай каманды ў гульнявых відах спорту. І не разумееш, адкуль гэта бярэцца, бо ў краіне існуе нейкія «тры з паловай» жаночыя клубы. Заробкі ў трэнераў маленькія. Ды нават за поспехі на чэмпіянаце свету нашым налічваліся мізэрныя прэміяльныя — 50 еўра за кожную перамогу.

Але перамогі прыйшлі і сёлета. Спачатку выйгралі ў крыўдзіцелек Алімпіяды — кітаянак, потым у канадак. Матч з Аўстраліяй можна было б таксама занесці сабе ў актыў, але, здаецца, трэнер Буяльскі не лічыў гэта за самамэту, ведаючы, што найбольш прынцыповыя гульні наперадзе.

У групавой стадыі самым важным быў матч з Грэцыяй. Вытрымалі. Пасля гэтай гульні і ўспомніліся ўсе тыя якасці, за якія мы ўжо палюбілі гэтую зборную некалькі гадоў таму.

Мудрая гульня Марчанкі, трохачковыя Троінай, стаічнасць Трафімавай, непараўнальная Верамеенка, а яшчэ забліскалі новымі гранямі маладзейшыя зорачкі, як Дурэйка і Ануфрыенка. Ну і, вядома, Леўчанка!

Яна, без пытанняў, была найлепшай на гэтым першынстве. Прычым, магчыма, нават сярод усіх удзельніц. Алена загартавалася ў гульнях жаночай НБА. Яна была сапраўдным лідарам як на пляцоўцы, так і па-за ёй. У кожнай гульні за Ленай заставалася больш за 10 пунктаў і падбораў. У яе гарэлі вочы, яна вяла за сабой астатніх.

Неяк так удала супала, што ўсе свае найлепшыя якасці дзяўчаты паказалі ў гульні з расіянкамі. Суперніцы не атрымалі ні шанца. Уся прастора для манеўраў была перакрыта. І выніковыя +17 не павінны нікога ўводзіць у зман. Так сапраўды выглядаў расклад сілаў у той дзень.

Расіянкі да гэтага дзесяць гадоў не заставаліся без медалёў. Для іх гэта быў сапраўдны ўдар. Радасці нашым не было межаў.




**Алена Леўчанка была на гэтым чэмпіянаце найлепшай.**

Ну а паўфінал з чэшкамі ўвогуле стаў жывым прыкладам гераічнасці нашых дзяўчат. Першынство праходзіла ў Чэхіі. І трэ было рыхтавацца, што суддзі, хай і падсвядома, будуць дапамагаць гаспадарам.

Гэта не заўзятарскія эмоцыі. Ва ўсіх спрэчных момантах арбітры бралі бок чэшак. Якіх тытанічных намаганняў нашым каштавала перавесці гульню ў дадатковы час! Бо яшчэ за 13 секунд да канца адставанне было роўным тром пунктам.

Суддзі не далі збыцца нашай мары. Варта было бачыць твар Насці Верамеенкі, калі яна чыста выбіла мяч з рукі чэшкі, а за гэта атрымала пяты фол. Яна што ёсць моцы стукнула мяч аб паркет і развяла рукамі, нібыта кажучы, што зрабіла ўсё магчымае. На большае не быў бы здатны ніхто.

Так, крыўдна. Зусім крышачку не хапіла да медалёў. Але зборная ўсё адно пакінула след у сэрцах. Колькі пазітыўных эмоцый падарылі гэтыя прыгажуні! У суботу ў сацыяльных сетках усе забыліся на выбары, абмяркоўвалі баскетбол.

Бясспрэчна яшчэ тое, што беларускі былі самай жаноцкай зборнай першынства. За спартыўнымі дасягненнямі яны не забываліся сачыць і за сабой. Звяртала ўвагу, што яны заўсёды выходзілі на матч з добрым манікюрам. Спрабавалі, як маглі, навесці прычоскі. Нават гулялі яны ў сукенках. Усе астатнія аддавалі перавагу шортам.

Пасля сканчэння спаборніцтваў накіраваў палове нашага складу віншаванні на сайце vkontakte.ru. Вельмі прыемна, што амаль усе адказалі імгненна. А Наталля Ануфрыенка нават па-беларуску.

**Зміцер Панкавец**

# Фантастычны БАТЭ

**Поспех баскетбалістак не быў адзіным у беларускіх спартоўцаў на гэтым тыдні.**

Пасля гульні групавога этапу Лігі Еўропы паміж БАТЭ і нідэрландскім АЗ абодва трэнеры сышліся ў меркаванні, што БАТЭ вечарам 30 верасня паказаў фантастычны футбол.

Шкада толькі, што не так многа людзей на стадыёне змагло падзяліць трыумф барысаўцаў. Цяжка сказаць, што таму віной: позні пачатак матча, не самае цёплае надвор’е ці праца міліцыі ў папярэдніх матчах (гэтым разам яна была больш карэктнай), але трыбуны былі зусім не запоўненымі. Што ж, злуйце цяпер самі на сябе, што не пайшлі на стадыён.

Злавіў сябе на думцы, што ўпершыню ў групавых раўндах еўратурніраў БАТЭ меў настолькі істотную перавагу ў гульні. Такой упэўненасці ў сваіх дзеяннях не было яшчэ ніколі. Не ўзнікала ніводнага сумневу, што пераможам.

Найбольш уражвае той паказчык, што за гульню беларусы нанеслі 29 удараў па варотах. Такое БАТЭ не ўдавалася нават у сустрэчах з хіленькім «Партызанам».

Феерычная гульня ў атацы. А яшчэ зноў геройчна гуляў у варотах Сяргей Верамко. Наш галкіпер адбіў пенальці ў другім запар матчы Лігі Еўропы. Наколькі важным быў чацвёрты гол Эдгара Аляхновіча. Хлопец два тыдні дакараў сябе за абрэзку ў Кіеве, праз якую барысаўцы так і не перамаглі.

Каб ацаніць каштоўнасць перамогі, варта адзначыць, з кім гуляў БАТЭ. Галандцы — даўнія заканадаўцы футбольнай моды. Зборная гэтай краіны гуляла ў фінале мундыялю. А клуб з Алкмара быў пераможцам папярэдняга чэмпіянату.

Агульны лік 4:1 на карысць БАТЭ быў абсалютна аб’ектыўным для гульні. Раней мяжой нашых мараў быў проста выхад у групавы турнір еўракубкаў. Цяпер мы ўжо марым пра плэй-оф. З часам прыходзяць новыя задачы. Добра, што не даводзіцца заніжаць планку.

Цяпер БАТЭ знаходзіцца на першым месцы ў групе, а наперадзе дзве гульні з малдаўскім «Шэрыфам» і не рэалізаваны да канца запас трываласці.

**ЗП**

## Крымінал сцісла

• **23-гадовую дзяўчыну зацягнула пад пілу.** У Брэсцкім раёне на пілараме загінула рабочая замежнага прадпрыемства «Вудімекспрам». Няшчасны выпадак адбыўся на тартаку ў вёсцы Вялікая Курніца. Цела вісела наківачовай піле, яго знайшлі рабочыя. Маладую жанчыну зацягнула пад нож. Устаноўлена, што загінулая не мела допуску да працы на гэтым абсталяванні.

• **Беларус «замініраваў» расійскі самалёт.** У валгаградскім аэрапорце аварыйна сеў пасажырскі самалёт Як-42, які здзяйсняў рэгулярны рэйс «Масква — Грозны». Прычынай аварыйнай пасадкі стала фальшывае паведамленне пра нібы закладзеную на борце авіялайнера бомбу. Пра бомбу паведаміў невядомы, які патэлефанаваў у аэрапорт «Унукава» з Мінска. Мяркуючы па запісе тэлефанавання, ён быў у крайняй стадыі алкагольнага ап’янення. Праваахоўнікі затрымалі 40-гадовага мінчука. Як высветлілася, мужчына адначасова «замініраваў» адразу два расійскія самалёты. Спачатку ён паведаміў пра бомбу на самалёце Масква — Сінгапур, а праз 5 хвілін — пра меркаваны выбух на самалёце Масква — Грозны. У першым выпадку «тэлефонны мінёр» тэлефанаваў з мабільнага, а ў другім — з хатняга тэлефона ў Мінску. Абодва нумары належалі аднаму і таму ж чалавеку — Дзмітрыю М.

• **У Бабруйскім раёне са стараверскай царквы скралі 14 абразоў.** Знікненне абразоў у вёсцы Туркаўская Слабада выявілі вернікі.

• **У двух мінчукоў канфіскаваныя галюцынагенныя грыбы.** Мінскім РУУС распачаты справы ў дачыненні да двух непрацуючых жыхароў сталіцы 1988 і 1990 гадоў нараджэння. Грыбы, што ўтрымліваюць псілацын, — псіхаактыўнае рэчыва-алкалоід — з сямейства трыптамінаў.

• **Кіем выбіў вока.** Не на жарт разышоўся 68-гадовы пенсіянер з вёскі Ястрабель Бярозаўскага раёна, калі стаў высвятляць адносіны з 66-гадовай сужыцелькай. У выніку бойкі жанчына трапіла ў бальніцу з выбітым вокам.

• **Жорстка адпомсціў за брата.** 19 ліпеня труп мужчыны са звязанымі рукамі і нагамі быў вылаўлены ў рацэ Пціч каля вёскі Млынок Петрыкаўскага раёна. Забітым аказаўся 45-гадовы жыхар Калінкавіч. У канцы жніўня былі затрыманы падазроныя ў забойстве — жыхары Калінкавіч і Мазыра 24, 23 і 19 гадоў. Матывам забойства стала помста. Сем гадоў таму ў Калінкавічах быў забіты мужчына — падчас бойкі яго штурханулі, ён зваліўся на бардзюр, атрымаў траўму галавы і пасля памёр. Вінаватага суд прыгаварыў да пазбаўлення волі. Пасля заканчэння тэрміну ён вярнуўся ў Калінкавічы. Даведаўшыся пра гэта, малодшы брат забітага вырашыў адпомсціць.

• **У Брытаніі схапілі хакераў-беларусаў.** У Вялікабрытаніі арыштаваныя 20 хакераў-імігрантаў з краін былога СССР, у тым ліку Беларусі. Яны скралі агулам больш за 6 млн фунтаў стэрлінгаў (каля 9 млн долараў)! Злачынцы выкарысталі вірус ZeuS, якім заразілі тысячы камп’ютараў у Вялікабрытаніі. Гэтая праграма выкрадала паролі, неабходныя для доступу да асабістых банкаўскіх рахункаў праз інтэрнэт.

• **Паўтара года калоніі за вялікае каханне.** У пяты раз у Ашмянах асуджаны грамадзянін Літвы, які ўжо на працягу чатырох гадоў упарта хадзіў з Літвы ў вёску Кібы Ашмянскага раёна да жонкі і дзяцей. Пры гэтым мяжу Беларусі ён перасякаў незаконна. На судзе Станіслаў расказаў, што ў 2000 годзе ён прыехаў у Беларусь, пазнаёміўся з жанчынай і стаў жыць з ёй у грамадзянскім шлюбе. У 2008 годзе ў Літве яны афіцыйна зарэгістравалі свае адносіны. Цяпер у іх двое дзяцей. Шэсць гадоў сыну і дзевяць — дачцэ. Але пакуль шлюб не зарэгістравалі, Станіслаў тройчы прыцягваўся да крымінальнай адказнасці за наўмыснае незаконнае перасячэнне мяжы. Таму яму не давалі візы. А цяпер і зусім адправілі ў турму на паўтара года.

• **Загінуў, прыціснуты ўласным аўтамабілем.** 32-гадовы жыхара пасёлка Бальшавік Мінскага раёна рамантаваў свой аўтамабіль і быў прыціснуты машынай у выніку зрушэння дамкрата.

**СМ**

# Андрэй Саннікаў: Мы моцныя



У ініцыятыўную групу Саннікава (справа) ўвайшлі Станіслаў Шушкевіч і Зміцер Бандарэнка.

УЛАДЗЬ ГРЫДЗІН

Лідар «Еўрапейскай Беларусі» Андрэй Саннікаў адмовіўся рабіць гутарку «У гасцях у кандыдата». «Не тая сітуацыя». Гутарка павінна быць сур'ёзнай, — мяркуе ён.

**«Наша Ніва»: Вы не ўдзельнічалі ў папярэдніх прэзідэнцкіх выбарах, чаму вырашылі ўзяць удзел на гэты раз?**

**Андрэй Саннікаў**: Я ўдзельнічаў ва ўсіх выбарах, ва ўсіх палітычных кампаніях, у тым ліку прэзідэнцкіх. У 2001 годзе я працаваў спачатку з Сямёнам Домашам, а пасля таго як быў абраны адзіным Уладзімір Ганчарык, то працаваў у ягонай кампаніі. У 2006 годзе — на кампанію Мілінкевіча. Але я быў не вельмі задаволеным, як будуць выкарыстоўвалі нашы ідэі, структуры, пазіцыю. Было вырашана, што мы маем вялікі досвед, маем патэнцыял. Маем самую моцную ў краіне каманду, таму і вырашылі пайсці на выбары.

**«НН»: А чаму Вы лічыце, што здольныя перамагчы Лукашэнку?**

**АС**: Таму, што я іду перамагаць дыктатуру. Я перакананы, што здолею прапанаваць народу альтэрнатыву. І людзі мяне падтрымаюць.

**«НН»: А ў чым ёсць Ваша альтэрнатыва?**

**АС**: Мая альтэрнатыва — нармальная Беларусь. Гэта інтэграцыя ў Еўрасаюз, імгненнае паляпшэнне адносінаў з Расіяй, якое ўключае ўсе аспекты, якія цікавяць Расію. Пры гэтым захоўваючы нашы нацыянальныя інтарэсы. Гэта нармалізацыя адносінаў з Украінай. Гэта вельмі важны партнёр. Ненармальна, калі ў адносінах двух вельмі блізкіх народаў які ўжо год ідзе гандаль па пагадненнях у памежнай зоне. Я бачу, што гэта цікавіць людзей, яны бачаць у гэтым мадэль развіцця Беларусі. Калі мы пойдзем такім кірункам, то будзе паляпшэнне жыцця ва ўсіх сферах. Найперш у эканоміцы, культуры. Нават у сацыяльнай сферы, дзе існуе міф, што Лукашэнка стварыў умовы для сацыяльнай абароны чалавека. Гэта хлусня.

## Станоўча ставіцца да прыватызацыі

**«НН»: Канкрэтная эканамічная праграма ў Вас маецца?**

**АС**: Праграма па галінах пакуль распрацоўваецца. Мы хацелі яе зрабіць на дадзеным этапе, але ўсё ж не варта. Бо шмат цікавых прапановаў, ідэй гучыць падчас сустрэч з людзьмі. Узнікаюць такія моманты, якія раней не ўлічвалі. Скажу, што гэтыя рэформы не будуць такімі складанымі для Беларусі, бо ёсць досвед суседзяў, як рухацца паводле крытэраў ЕС. Цікавы досвед Літвы па сельскай гаспадарцы, цікава, як Эстонія, Польшча вытрымала крызіс. Ці чаму суперлібералізацыя Чэхіі прывяла да праблемаў, а Славакія пасля Мечыяра зрабіла моцны рывок наперад? Гэта найбагацейшы досвед. Мы будзем ім карыстацца.

**«НН»: Ці ўсё створанае пры Лукашэнку ў эканоміцы трэба ламаць?**

**АС**: Лукашэнка не будаваў хату з фундамента. За савецкім часам гэта была даволі разгалінаваная эканоміка, але і цяжкая для такой краіны, як наша. Я не прымаю камандна-прымусовай сістэмы. Яна павінна быць разбурана. Але калі пабудаваны нейкі добры будынак, то што ў гэтым кепскага? Дарэчы, добрых будынкаў я як карэнны мінчанін у сталіцы не заўважаў. Я не прымаю аграгарадкоў, гэта разбурае сельскую гаспадарку. Ці будаўніцтва лядовых палацаў, калі не хапае на медыцыну. Калі былі Дажынкі ў Кобрыне, то там пабудавалі аквапарк. Пакажыце мне, хто туды ходзіць.

**«НН»: Якое Ваша стаўленне да прыватызацыі буйных прадпрыемстваў?**

**АС**: Станоўчае. Нешта трэба рабіць з прадпрыемствамі. Састарэласць вытворчасці ўжо нікуды не схаваеш нават прапагандыстамі. Як паветра патрэбна мадэрнізацыя. Але без падзелу ўлады і свабоднай прэсы не можа быць ніякай прыватызацыі. Я не бачу іншай магчымасці, акрамя кантролю грамадскасці праз СМІ. Таксама прыватызацыю прадпрыемстваў можна рабіць, толькі ўлічваючы інтарэсы тых, хто там працуе, — і рабочых, і менеджараў. Тое, што робіць цяпер з прыватызацыяй дыктатар, мяне палохае. Бо яна закрытая, таемная.

**«НН»: То бок для Вас не так істотна, ці гэта прыйдзе расійскі, ці еўрапейскі інвестар?**

**АС**: Істотна, каб працавалі законы. Каб прыходзілі найлепшыя, самыя вядомыя ў свеце брэнды. Каб прыходзілі высокія тэхналогіі, а не нейкі сэканд-хэнд. Паважаю ўсе краіны, але тыя ж кітайцы вельмі часта даюць не самы якасны прадукт.

## «Еўрасаюз — гэта гісторыя поспеху»

**«НН»: Вашай мэтай ёсць уступленне Беларусі ў ЕС?**

**АС**: Так.

**«НН»: А як тады будаваць адносіны з Расіяй?**

**АС**: Нармальна. Прыводзіў і прыводжу прыклад Украіны. Гэта будзённая праца ўкраінскіх чыноўнікаў, накіраваная на ўступленне ў ЕС. Гэта не палохае расіян. І Беларусь не павінна палохаць. Больш за тое, Расія павінна быць зацікаўленай у сяброўстве Украіны і Беларусі ў ЕС. Чаму? Бо гэта павялічыць уплыў Расіі ў Еўропе. У сваю чаргу, гэта павялічыць абарону інтарэсаў нашых краін у Еўрасаюзе. Расія не пойдзе ў ЕС, але яна хоча жыць па еўрапейскіх стандартах. Я чытаю расійскіх аналітыкаў, гляджу ТБ, дык там толькі і кажуць, што пра Еўропу. Там ёсць жаданне нешта перабудаваць згодна з эфектыўнай мадэллю, а эфектыўная мадэль існуе ў Еўропе. Еўрасаюз — гэта гісторыя поспеху, што б ні казалі. Гэтая стратэгія развіцця супадае з нашымі памкненнямі.

**«НН»: А як ставіцеся да таго, што Вас часам называюць прарасійскім палітыкам?**

**АС**: Не задзявае. Я не толькі за незалежнасць, я таксама за свабоду. А Лукашэнка змагаецца з Расіяй, і што гэта дае Беларусі? З такой барацьбой за незалежнасць мы можам хутка прыйсці да ідэй чучхе. Іран, Куба і Венесуэла будуць нашымі гарантамі самастойнасці. Калі адкінуць некаторыя ідэалагічныя стэрэатыпы, то можна іншымі вачыма паглядзець на свет. Можна знайсці ў Расіі нават дапамогу ў руху ў Еўрасаюз. Гэта не неверагодна. У Расіі сёння больш кантактаў з Еўропай, чым у нас.

**«НН»: Вы б прынялі такую дапамогу?**

**АС**: Відавочна.

## «Мы моцныя, бо вытрымалі жорсткую дыктатуру»

**«НН»: Падзяляеце думку, што Лукашэнка слабы як ніколі, але і апазіцыя слабая таксама?**

**АС**: Не. Тое, што ёсць шмат кандыдатаў, гэта нармальна. Калі пойдуць кандыдаты з альтэрнатыўнымі прапановамі, то гэта будзе спрыяць мабілізацыі. Зараз можна ўпэўнена сцвярджаць, што другі тур проста непазбежны. Тое, што апазіцыя слабая і раздробленая, мы чуем шмат гадоў. Я гэтага ніколі не казаў і не вітаў. Апазіцыя моцная, бо мы вытрымалі падчас вельмі жорсткай дыктатуры. Калі быць у апазіцыі знаходзяць мужнасць адзін-два чалавекі, то гэта ўжо вельмі добра. А калі іх тысячы, то гэта патэнцыял, які можа выдатна спрацаваць падчас прэзідэнцкай кампаніі. Я разлічваю размаўляць і кансультавацца з іншымі сур'ёзнымі кандыдатамі. Мой супернік — Лукашэнка, а кандыдаты ад апазіцыі — сябры, калегі. Размаўляць з Лукашэнкам я не буду, як прапаноўваў некалі. Цяпер час не для размоваў.

**«НН»: А што думаеце пра адмову Мілінкевіча ўдзельнічаць у выбарах?**

**АС**: Думаю, што гэта слушнае рашэнне. Калі Мілінкевіч заняў пазіцыю падтрымкі дыялога паміж Брусэлем і Лукашэнкам, я быў катэгарычна супраць. Гэтая пазіцыя вяла да маргіналізацыі дэмакратычных сілаў. Сённяшняе рашэнне Мілінкевіча разважлівае, яно дапаможа кансалідацыі апазіцыі.

## «Чыноўнікам трэба вызначацца»

**«НН»: Якую рэформу Вы рыхтуеце міліцыі?**

**АС**: Паліцыя. Мы рухаемся ў Еўропу, і таму павінны быць еўрапейскія стандарты. Там няма ўмяшальніцтва ў тваё прыватнае жыццё. Я спакойна адчуваю сябе, калі бачу нямецкага ці французскага даішніка, бо нічога не парушаў. У нас жа міжволі пачынаеш нервавацца. Зараз міліцыю выкарыстоўваюць у палітычных мэтах таксама і гэта больш заўважна за іх звычайную працу. Хаця працу яны сваю робяць, злачынствы раскрываюць. Але ў грамадстве яны атаясамліваюцца з людзьмі, што выконваюць загады Лукашэнкі. Павінны быць законы, і жыць трэба паводле гэтых законаў.

**«НН»: А што датычыць войска?**

**АС**: Павінна быць прафесійнае войска, але і прызыў мусіць заставацца. Для поўнай прафесіяналізацыі спатрэбіцца час. Мы будзем мець сучаснае еўрапейскае войска. У НАТО ўступаць мы не будзем. У адпаведнасці з Канстытуцыяй будзем нейтральнай дзяржавай.

**«НН»: Ці шмат Вы бачыце сярод сённяшніх чыноўнікаў сапраўдных прафесіяналаў?**

**АС**: Вельмі шмат. Але ім трэба рабіць выбар. Калі яны зараз будуць падтрымліваць Лукашэнку, то людзі не зразумеюць, што яны робяць у новым урадзе Беларусі. Нашы эксперты і чыноўнікі яшчэ да Лукашэнкі вельмі цаніліся ў Еўропе і ЗША. Нашы людзі не будуць крычаць, што яны найлепшыя, але робяць усё, каб быць такімі.

**«НН»: Што Вы думаеце наконт люстрацыі?**

**АС**: Я лічу, што новая ўлада павінна пазбавіць грамадскасць канфліктаў. Не, люстрацыі не трэба.

## «Калі Лукашэнка не сыдзе, то Плошча»

**«НН»: Вы за пашырэнне ўжытку беларускай мовы?**

**АС**: Канечне. Трэба прафесійнае маладое якаснае тэлебачанне на беларускай мове. Эфект будзе ашаламляльны. Трэба добрая літаратура, у комплексе: дзіцячая, прафесійная. Ніякага гвалтоўнага ўвядзення мовы не будзе. Людзі ў мяне часам пытаюцца: можа, усё ж пакінуць дзве дзяржаўныя мовы? Не! Ніяк не здолеем мы паважаць сябе, калі не будзе нашай мовы. Але ніякага ціску на рускамоўных не будзе. Гэта пры Лукашэнку ёсць ціск на беларускамоўных. Няма ў краіне беларускіх універсітэтаў. Людзей проста трэба прывабліваць.

**«НН»: Лёс выбараў будзе вырашацца на Плошчы?**

**АС**: Падаецца, што так. Калі раптам не запануе закон і не сыдзе ў адстаўку Лукашэнка, то тады Плошча.

**«НН»: А ўздым у людзей бачыце?**

**АС**: Я бачу як беларусы пачалі выпростваць спіны. Мяне цешыць адзінства сярод кандыдатаў, што трэба заклікаць людзей на вуліцу.

**Гутарыў Зміцер Панкавец**

---

**Андрэй Саннікаў**

нар. у Мінску ў 1954. Скончыў Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт. Працаваў перакладчыкам у Пакістане і Егіпце. У 1982—1985 працаваў у Сакратарыяце ААН у Нью-Ёрку. Пасля сканчэння Маскоўскай дыпламатычнай акадэміі ў 1989 — у Міністэрстве замежных справаў Беларусі. У 1995 прызначаны намеснікам міністра замежных справаў Беларусі. З лістапада 1996 перайшоў у апазіцыю, стаў міжнародным каардынатарам грамадскай ініцыятывы «Хартыя-97». Мае дыпламатычны ранг пасла. Жанаты, мае сына.

# Выбары ва ўмовах лібералізацыі



PHOTO.BYMEDIA.NET

Жаданне ўзяць удзел у выбарах сёлета выказала дзевятнаццаць чалавек. Гэта меней, чым было ў 2001 (27 чалавек), але болей за 2006 (толькі 8).

### Найбольшая група ў Някляева

Прадэмакратычных кандыдатаў на этап збору подпісаў выйшла восем: Уладзімір Някляеў («Гавары праўду»), Андрэй Саннікаў («Еўрапейская Беларусь»), Алесь Міхалевіч («За мадэрнізацыю»), Рыгор Кастусёў (Партыя БНФ), Яраслаў Раманчук (АГП), Віталь Рымашэўскі (БХД), Мікола Статкевіч (сацыял-дэмакраты), Юры Глушакоў (зялёныя).

Апошні — відавочны аўтсайдар кампаніі, а вось ва ўсіх астатніх ініцыятыўныя групы налічваюць больш за тысячу чалавек. Увогуле ж, найбольшая група сярод апанентаў улады ва Уладзіміра Някляева — 3275 чалавек, у Андрэя Саннікава — 2000, у Алеся Міхалевіча — 1800.

### Ярмошына параўнала Лукашэнку з вязнем

Пры рэгістрацыі ініцыятыўных групаў пытанні ўзніклі па трох: Аляксандру Лукашэнку, Сяргею Гайдукевічу і Уладзіміру Някляеву.

Віцебскі прадпрымальнік Уладзімір Правальскі падаў у ЦВК заяву, у якой прасіў не рэгістраваць групу Лукашэнкі, бо той асабіста не падаваў сваіх дакументаў.

Ярмошына патлумачыла, што дакументы можа перадаць і давераная асоба, то бок Аляксандр Радзькоў.

У прыклад яна прывяла прэзідэнцкія выбары 2006 года. Тады кандыдат Сяргей Скрабец не мог персанальна перадаць дакументы, бо сядзеў у следчым ізалятары. Такім чынам, кіраўніца Цэнтрвыбаркама параўнала Лукашэнку са зняволеным.

Правальскі, у сваю чаргу, заявіў, што ў адну з выбарчых кампаніяў яго не зарэгістравалі кандыдатам у дэпутаты, бо ён не прысутнічаў па паседжанні выбарчай камісіі, калі тая разглядала яго дакументы.

«Выходзіць, для адных закон ёсць, а для другіх — няма», — падсумаваў Правальскі. Гэтыя словы прысутныя ў зале сустрэлі апладысментамі.

### Гайдукевіч і мёртвыя душы

Што да Гайдукевіча, то ў ягоным вялізным спісе выявіліся «мёртвыя душы». Сваё прозвішча там знайшоў нават адзін з сяброў ЦВК, які пра тое ні сном ні духам.

Яшчэ ў Гайдукевіча пабачылі ў спісах трыццаць арабскіх і ўсходніх прозвішчаў. Двое сяброў ЦВК былі супраць рэгістрацыі («Не трэба ператвараць выбары ў клаўнаду»), але абсалютная большасць выказалася «за».

«Што за выбары без Гайдукевіча?» — абсёк сваіх калег сакратар ЦВК Мікалай Лазавік.

Што тычыцца Някляева, дык камісію цікавілі гады, праведзеныя паэтам за мяжой. Творчая камандзіроўка ці эміграцыя? Сышліся на першым варыянце.

Таксама рэгістрацыю атрымалі шматлікія невялікія групы нікому невядомых кандыдатаў.

### Раманчук «дужа худзенькі»

30 верасня пачаўся ўласна збор подпісаў. У першы дзень на Камароўцы стаялі тры пікеты: Саннікава, Кастусёва і Раманчука.

Найбольш актыўна распісваліся за Саннікава. Нават чэргі невялікія ўтварыліся. А вось за Кастусёва спяшаліся распісацца не ўсе, бо адны хацелі за Лукашэнку, а іншыя — за Пазняка. Варта зазначыць, што толькі за Кастусёва подпісы збіраюць задарма. Іншыя прэтэндэнты абяцаюць бонусы за сабраныя подпісы.

Што датычыць Раманчука, то ці не галоўнай прэтэнзіяй выбарцаў было тое, што кандыдат «такі худзенькі». У Амерыцы ці Швецыі — гэта быў бы відавочны плюс, а ў нас во недахоп.

А вось Міхалевіч і Рымашэўскі стаўку робяць не на сталіцу, а на рэгіёны. Па словах Паўла Севярынца, толькі ў Бабруйску (родны горад кандыдата) за Рымашэўскага ўдалося сабраць аж 2500 подпісаў за 4 дні. За Міхалевіча ў Барысаве — 900.

### Выклікаў міліцыю на зборшчыкаў Лукашэнкі

Пікеты за Аляксандра Лукашэнку плаўна раскіданы па ўсёй сталіцы. Маладыя людзі пад дзяржаўным сцягам і партрэтам лідара заклікаюць распісацца за свайго кандыдата. Асаблівага ажыятажу сярод іх няма.

Хітом у інтэрнэце сталі здымкі, як подпісы за Лукашэнку збіраюць ля кінатэатра пад афішамі камедыі «Зноў ты» і фільма жахаў «Абіцель зла — 4».

Анекдатычны выпадак адбыўся ў панядзелак. Прадпрымальнік Алесь Таўстыка выклікаў міліцыю на зборшчыкаў подпісаў за Лукашэнку, бо тыя не мелі пасведчанняў сяброў ініцыятыўнай групы. Ясна, што нікога не затрымалі.

### Лукашэнка спадзяецца на прызнанне выбараў

На дадзены момант усе апазіцыйныя кандыдаты заяўляюць пра тое, што набралі больш за 15 тысяч подпісаў.

Калі верыць прэтэндэнтам на слова, то ўсе яны зараз укладваюцца ў неабходную планку ў 100 тысяч подпісаў.

Лукашэнка ж на прэс-канферэнцыі з расійскімі журналістамі заявіў пра тое, што хацеў бы, каб за яго прагаласавала дзве траціны насельніцтва. Гэта відавочны сігнал Захаду, каб выбары былі прызнаныя легітымнымі. Разам з тым, гэта праява слабасці Лукашэнкі.

Выглядае на тое, што ЦВК таксама сёлета настроены рэгістраваць абсалютна ўсіх кандыдатаў, што заявяць пра збор неабходнай колькасці.

Увогуле, трэба зазначыць, што пакуль выбары праходзяць ва ўмовах поўнай лібералізацыі. Няма ніякіх затрыманняў, арыштаў,ператрусаў, якія былі характэрныя папярэднім кампаніям.

**Зміцер Панкавец**

## Лукашэнкаўцы раскрылі тайныя планы апазіцыі

Рэдактар «Беларускай думкі» апублікаваў сенсацыйны матэрыял.

Калі верыць Вадзіму Гігіну, «адзін лідар апазіцыі» выдаў яму «планы апазіцыі» пасля прыходу да ўлады. Напэўна, аўтар хацеў вымаляваць нейкую жахалку. Атрыманы ж тэкст выклікаў дзікі рогат інтэрнаўтаў.

Гігін сцвярджае, што канчатковы план быў зацверджаны на сустрэчы чатырох кандыдатаў у вёсцы Берcшты на Гродзеншчыне.

Такім чынам, апазіцыя прапануе пасля «захопу ўлады» (жах!): прыцягненне да адказнасці вышэйшага кіраўніцтва краіны, пераход да парламенцкай рэспублікі, тэрытарыяльна-адміністрацыйная рэформа, перавод усяго справаводства на беларускую мову, прыватызацыю прадпрыемстваў і ўвядзенне ўласнасці на зямлю, выхад з саюзнай дзяржавы.

А для поўнай даставернасці: апазіцыя ўжо аддрукавала плакаты з Францам Кушалем для ідэалагічнай апрацоўкі насельніцтва і прызначыць Франака Вячорку кіраўніком КДБ.

**ЗП**

## Зміцер Дашкевіч: Не бойцеся рускіх!

Лідар «Маладога фронту» аб прэзідэнцкіх выбарах.

«Давайце кожны зоймецца сваёю тактыкаю і стратэгіяй, а сустрэнемся ўсе на Плошчы. А пасля разбяромся і з расійскімі вектарамі, і з заходнімі. Не ведаю як хто, а я перакананы, што на свабодным рынку ідэяў мы здолеем не толькі адстаяць, але і адрадзіць справу Беларушчыны. Таму, таварышы-дэмакраты, не бойцеся рускіх. Нікуды яны ад нас не збягуць».

## ДЗЕ ПАДПІСАЦЦА ЗА КАНДЫДАТА?

**Кастусёў**

У Мінску свой подпіс за Рыгора Кастусёва можна паставіць па адрасе пр. Машэрава, 8 (офіс Партыі БНФ) па буднях 10:00—20:00 і па выходных 10:00—18:00 альбо штодня на адным з пікетаў. Напрыклад, метро «Кастрычніцкая» (12:00—19:00).

У рэгіёнах з ініцыятыўнай групай Кастусёва можна звязацца праз наступныя тэл.:
Брэст (029) 699 38 94,
Віцебск (029) 750 16 79,
Гродна (029) 390 63 18,
Гомель (044) 471 59 83,
Магілёў (029) 129 03 77.

**Міхалевіч**

Алесь Міхалевіч пакуль пікетаў у сваю падтрымку не праводзіць. Палітык робіць стаўку на абыход кватэр.

**Някляеў**

За Някляева ў Мінску можна падпісацца штодня на адным з пікетаў. Напрыклад, метро «Кастрычніцкая» — ГУМ,
метро «Кастрычніцкая» — універсам «Цэнтральны».
метро «Кунцаўшчына» — рынак «Заходні»,
метро «Пушкінская» — выхад з метро ў бок «Макдональдса»,
метро «Партызанская» — ля ўвахода ва ўніверсам «Беларусь»,
метро «Магілёўская» (у бок аўтастанцыі),
метро «Няміга» — (каля Петрапаўлаўскай царквы каля «Дома на Нямізе»),
метро «Якуба Коласа» — вуліца Веры Харужай (каля ГЦ «Імпульс»),
Брэст: вул.Пушкінская, каля ўвахода на рынак.
Па ўсіх пытаннях можна звяртацца па нумары (025) 648 48 44.

**Раманчук**

За Яраслава Раманчука ў Менску можна падпісацца на адным з пікетаў. Напрыклад, падземны пераход на пл. Якуба Коласа, падземны пераход ля ЦУМа.
Тэлефон для кантактаў (017) 283 18 99.

**Рымашэўскі**

Мінск:
раён Камароўскага рынку,
раён чыгуначнага вакзала.
Адрасы пікетаў у 15 іншых гарадах можна знайсці на сайце bchd.info.
Кантакты рэгіянальных прадстаўніцтваў:
Брэст — Зміцер Шурхай (033) 698 41 27,
Віцебск — Таццяна Севярынец (029) 597 70 49,
Гродна — Мікалай Баўсюк (033) 655 52 49,
Магілёў — Таіса Кабанчук (029) 615 28 37,
Гомель — Зайцава Тамара (029) 737 76 08.

**Саннікаў**

Паставіць подпіс за вылучэнне Андрэя Саннікава можна, напрыклад: уваход ва ўнівермаг ГУМ (9.00—20.00), метро «Пушкінская», выхад да гасцініцы «Арбіта» (10.00—19.00).
У рэгіёнах:
Брэст — «Цэнтральны рынак» (з 12.00 да 18.00).
Віцебск — плошча Свабоды (з 15.00 да 18.00).
Магілёў — кінатэатр «Радзіма» (з 12.00 да 18.00).
Гродна — галоўны ўваход на Скідзельскі рынак (з 11.00 да 13.00).
Гомель — універмаг «Гомель» (з 10.00 да 13.00).
Полацк — «Дом гандлю» (12.00–19.00).
Адрасы пікетаў у 15 іншых гарадах можна знайсці на сайце charter97.org.

**Статкевіч**

Мікола Статкевіч таксама пакуль не выкарыстоўвае пікетаў для збору подпісаў.

**Алесь Пілецкі**

# Хто колькі абяцае за подпіс?

Вылучаюцца з агульнага спісу два кандыдаты: Уладзімір Някляеў і Рыгор Кастусёў.

30 верасня кандыдаты ў прэзідэнты пачалі збор подпісаў. Мала для каго сакрэт, што штабы кандыдатаў аплочваюць сябрам сваёй ініцыятыўнай групы такую працу. Хто з кандыдатаў колькі прапануе?

Трэба адзначыць, што ў большасці апазіцыйных кандыдатаў расцэнкі аднолькавыя — 1,5 тысячы за кожны подпіс. Гэткія грошы, паводле інфармацыі «Нашай Нівы», прапануюць Андрэй Саннікаў, Алесь Міхалевіч, Віталь Рымашэўскі, Мікола Статкевіч, Яраслаў Раманчук.

Такім чынам, выходзіць, што толькі на этап збору подпісаў кандыдату патрэбна каля 50 тысяч даляраў. Але не варта думаць, што абсалютна ўсе збіраюць подпісы за грошы. Натуральна, у камандах кожнага з кандыдатаў ёсць і такія людзі, якія працуюць з ідэйных перакананняў, а не каб зарабіць.

Вылучаюцца з агульнага спісу толькі два кандыдаты: Уладзімір Някляеў і Рыгор Кастусёў. Стаўка ў «Гавары праўду» істотна большая, чым у іншых кандыдатаў, — 1,5 даляра за аўтограф. Можа, таму і ініцыятыўная група ў Някляева большая, чым у іншых апазіцыйных палітыкаў.

А вось за Рыгора Кастусёва людзі подпісы будуць збіраць абсалютна задарма, за ідэю.

Такая пазіцыя бліжэйшая да еўрапейскіх нормаў. Там валанцёры на выбарчых кампаніях таксама працуюць бясплатна. Але гэта хутчэй паказчык дэмакратычных грамадстваў. У Беларусі ж, дзе людзі часта губляюць за свае палітычныя перакананні працу, выбары — рызыкоўная адказнасць.

Аляксандру Лукашэнку плаціць асобна за працу сяброў ініцыятыўнай групы няма патрэбы. Шматтысячны ідэалагічны і інфармацыйны апарат працуе не «на ганарарах», а на «стаўках».

Пры гэтым лукашэнкаўцы яшчэ і хваляцца, што збіраць подпісы яны будуць у час «пасля працы».

А вось Сяргей Гайдукевіч і Віктар Цярэшчанка таксама вымушаныя плаціць сваім актывістам. Прычым у апошняга, паводле інфармацыі «Нашай Нівы», сума большая, чым у асноўнай частцы апазіцыянераў.

Зрэшты, нярэдка падчас папярэдніх кампаній бывала так, што кандыдат абяцае за подпісы адну суму, а потым не можа расплаціцца. З падобнай праблемай у 2001 годзе сутыкнуўся Леанід Сініцын. Хто ведае, ці не паўторыцца гэта ў каго з кандыдатаў і сёлета.

Юрыст Сяргей Альфер не бачыць у падобнай практыцы аплаты нічога супрацьзаконнага. «Тыя кандыдаты, хто будзе зарэгістраваны, створаць выбарчыя фонды. Дык вось грошы з гэтых фондаў яны могуць размяркоўваць, як захочуць: ці гэта будзе аплата валанцёраў, ці дадатковы друк інфармацыйных матэрыялаў».

**Зміцер Панкавец**

# Ці стане Саннікаў адзіным кандыдатам?

Найбольшыя чэргі ў Мінску выстройваюцца каля пікетаў лідара «Еўрапейскай Беларусі».

Гэта прызнаюць і сябры канкурэнтных ініцыятыўных групаў.

Саннікаў выйшаў на першае месца і ў абароненых ад падкрутак інтэрнэт-апытанках.

Пры гэтым Саннікаву ўдалося сабраць другую па колькасці ініцыятыўную групу сярод прадэмакратычных палітыкаў.

У чым ягоная прывабнасць? Ці гэта тлумачыцца тым, што ён аднолькава прымальны і для Захаду, і для Расіі, пра што выразна заявілі маскоўскія СМІ?

Думаецца, першасная прычына ў іншым.

Саннікаў — найбольш радыкальны крытык Лукашэнкі сярод усіх апазіцыйных кандыдатаў. Ён не гуляе ў «канструктыўную апазіцыю». Ён не абмінае маўчаннем мадам працэнтніцу. І не стамляецца паўтараць: дыктатара не перамагаюць на выбарах. Толькі Плошча можа паказаць краіне, што нацыя стаіць не за дыктатарам, а за перамены — ключавы момант для змены сістэмы.

Спецыфіка гэтых выбараў ці, калі хочаце, нават нацыянальнага характару палягае на тым моманцку, што нават людзі, якія ў выбары не вераць ды палітыкам не вераць, і каму дэмакратыя як сабаку пятая нага, і хто ўрэшце галасуе за Бацьку, бо як усе, — нават гэтыя беларусы хочуць, каб Лукашэнку ўрэзалі хоць на словах. Каб быў выказнік той вялікай, экзістэнцыйнай крыўды, якую Беларусь зазнала ад Лукашэнкі і якую не адкупляе ніякі эканамічны рост. І Саннікаў, калючы Саннікаў, трапляе ў гэтыя чаканні.

Дарэчы, не такія ўжо і дурныя людзі ў гэткім сваім, здавалася б, куртатым жаданні. Толькі наяўнасць моцнага артыкуляванай альтэрнатывы можа стаць рухавіком пазітыўных зменаў, хоць за дэмакратыі, хоць за дыктатуры.

Стыль Саннікава кантрастуе са стрыманым падыходам Мілінкевіча. Саннікаў не баіцца ісці на канфлікт. Гэты, думаюць актывісты, і на тэледэбатах з Лукашэнкам за словам у кішэню не палезе.

Радыкалізм заўжды прывабны на этапе праймерыз, якімі ў беларускіх умовах фактычна і ёсць збор подпісаў. Саннікаў умела камбінуе беларускі патрыятызм і еўрапейскую перспектыву.

Ён мае пазнавальную біяграфію: дзед-купалавец; жонка, сустрэтая на незалежніцкіх барыкадах; права подпісу на перамовах па ядзернай зброі. Гэта выгадна вылучае яго сярод іншых правацэнтрысцкіх кандыдатаў, што выскачылі як Пііліпы з канапель.

Саннікаў таксама збірае плён прадуманай медыйнай працы. Ён стварыў самы папулярны апазіцыйны палітычны сайт — charter97.org, далёкі ад класічных уяўленняў пра СМІ. А цяпер Саннікава падтрымала і самая масавая папяровая газета — «Народная воля», палітычным аглядальнікам якой ён стаў.

Саннікаў згуртаваў вакол сябе шэраг знакавых постацяў незалежніцкага руху: Шушкевіч, Івашкевіч, акадэмік Гарэцкі і лідар зуброўцаў Афнагель.

Немалаважна ў структуры ягонай падтрымкі тое, што Саннікаў абдумана і паслядоўна парушаў многія правілы — як тыя, якія навязвала дыктатура, так і тыя, якія стваралі сабе дысідэнты.

Ён не будаваў партыі — ва ўмовах, калі дыктатура талеравала клубныя партыі апазіцыі. Ён не дабіваўся рэгістрацыі сваёй суполкі. Ён акумуляваў рэсурсы — калі этыка патрабавала ад дысідэнцкіх групаў працы ў стане вечнага безграшоўя. «Хартыя'97» ад пачатку не захаплялася плюралізмам, а жорстка мадэравала свае форумы, каб выключыць магчымасці маніпулявання свядомасцю, якое лукашэнкаўцы ажыццяўляюць на некаторых іншых рэсурсах. «Дыктатуру можна перамагчы толькі адэкватнымі метадамі», — перакананыя многія разам з Саннікавым.

Несумненна, што ў абліччы Саннікава рэжым мае аднаго з самых дасведчаных праціўнікаў.

Ці можа Саннікаў стаць адзіным кандыдатам ад апазіцыі? Здавалася б, наяўнасць «Гавары праўду» такі шанец амаль выключае.

У рэальнасці ўсё будзе залежаць і ад колькасці подпісаў, сабраных тым ці іншым кандыдатам, і ад сацыялогіі.

За год дзейнасці Някляеву не ўдалося істотна пацясніць Мілінкевіча. Калі сацыялогія зафіксуе, а расійскія тэлеканалы замацуюць рывок Саннікава, то, у адсутнасць Мілінкевіча, Саннікаў можа стаць супольным назоўнікам.

Але не трэба забывацца: пакуль Саннікаву ўдалося вылучыцца толькі сярод палітызаванай публікі.

У рэгіёнах яго па-ранейшаму мала ведаюць, ініцыятыўныя групы яго там слабыя, а беларускія масы застаюцца ў ілюзіі, што Лукашэнка — гэта адзіны збаўца і паратунак нашай беднай старонкі.

Апорай Саннікава можа стаць сталіца.

Ці мае Саннікаў ці хто-кольвек іншы шанцы на падтрымку большасці ў цяперашняй сітуацыі? Палітолагі Сіліцкі і Булгакаў мяркуюць, што ніхто з сёлетніх кандыдатаў у прэзідэнты няздольны сабраць Плошчу. Між тым, толькі Плошчай можна вымераць іх уздзеянне на розумы.

Нарэшце, цікавы факт — зафіксаваны і рэпарцёрамі «Нашай Нівы», і блогерамі — мінчукі ў масе сваёй з абыякавасцю і кепікамі ставяцца да лукашэнкаўскіх пікетаў.

**Андрэй Дынько**

## Някляеў і кот Барсік падпісалі мемарандум

Падчас аднаго з нядаўніх інтэрв'ю лідар кампаніі «Гавары праўду» Уладзімір Някляеў прызнаўся, што ў дзяцінстве забіў ката.

Жорстка забіў — узяў за хвост і размазджэрыў яму галаву аб сценку.

Тое, што здарылася потым, можна назваць медыя-вірусам. Ката-Някляева абмяркоўвалі ўсе. Апаненты забыліся нават неадназначны пункт інтэграцыі з Расіяй у праграме Някляева, а пачалі ліць слёзы па забітым пяцьдзясят гадоў таму коціку. А «зялёныя» заклікалі не рэгістраваць такога кандыдата.

«Някляеўцы» вырашылі зрабіць на гэтай гісторыі піяр. Кандыдат у прэзідэнты ў прысутнасці журналістаў падпісаў мемарандум... з катом Барсікам аб забыцці мінулых крыўдаў.

«Дурата нейкая! Напачатку напартачыў, а цяпер нейкі цырк робіць», — зрэагаваў на гэта чытач Мікола на сайце NN.BY.

**ЗП**

# «Міс Грудзі» ўвайшла ў ініцыятыўныя групы Някляева і Раманчука



УЛАДЗЬ ГРЫДЗІН

«У зборы подпісаў нам шанцуе, бо кандыдат даволі моцны і група адпаведная: Анатоль Лябедзька, Аляксандр Дабравольскі, трое асуджаных за «МФ» байцоў з рэжымам — Салаўёва, Корбан, Грышчэня, а таксама ў нашых шэрагах **Кацярына Нікандрава, Міс грудзі Беларусь-2010» (на фота)**, — напісаў у сваім фэйсбуку Алег Корбан, які збірае подпісы за Яраслава Раманчука.

Сапраўды, Кацярына Нікандрава ў шэрагах дзвюх ініцыятыўных груп — Яраслава Раманчука і Уладзіміра Някляева.

Кацярыне 23 гады, яна працавала настаўніцай французскай мовы ў адной з мінскіх гімназій. Пасля таго ж, як у верасні выйграла ў штогадовым конкурсе «Міс грудзі Беларусі», перайшла на працу ў мінскі цэнтр «Сітраена». Там займае пасаду асістэнта дырэктара з веданнем французскай мовы.

Цікава, дзе яна будзе збіраць подпісы?

**ЗП**

# Кампанія ў стылі a la Russe

**Праблема нават не ў тым, што абсалютная большасць лідараў ГОП–кампаніі арыентуецца на Усход. Піша Віталь Сіліцкі.**




**Блогеры іранізуюць над спробамі Някляева заручыцца падтрымкай Расіі.**

Папярэднія прэзідэнцкія кампаніі ў Беларусі праходзілі па тыповым усходнееўрапейскім сцэнары. Там яны, тут мы. Тут дэмакратыя, там дыктатура. Тут белае, там чорнае ці чырвонае. Тут Захад, там Усход.

Наколькі перспектыўным быў такі падзел для апазіцыі, застаецца пытаннем — да перамогі яна рэальна ніколі не набліжалася, хіба была здольная, як у 2006 годзе, скансалідаваць пратэставы электарат, якога хапала толькі на сведчанне таго, што ў Беларусі можа быць і іншая Беларусь.

Сёньняшняя кампанія працякае ў цалкам новым стылі. На апазіцыйнай прасторы пачаўся сезон цудаў.

Адзін вядомы палітык, які апошнім часам, як высветлілася, быў журналістам, яшчэ год таму ў маёй прысутнасці даводзіў аднаму адстаўному еўрапейскаму прэзідэнту, што Беларусь — гэта сапраўды апошняя дыктатура ў Еўропе, бо азіяцкую Расію да Еўропы адносіць нельга. Цяпер гэты журналіст скрозь фігуруе на інфармацыйных каналах, крышаваных ФСБ, дзе ён раскручваецца як галоўны апанент Лукашэнкі, вядома, з іншай рыторыкай.

На аднаго маладзевага актывіста раптам сышло адкравенне, і ён пачаў актыўна заклікаць не баяцца новых хаўруснікаў журналіста-палітыка.

Іншы кандыдат у прэзідэнты, які пяць год таму заклікаў да байкоту фальшывых выбараў, цяпер упэўнены ва ўласнай перамозе і кіруе самым, здавалася б, экстравагантным палітычным праектам за апошнія дзесяцігоддзі — хаця экстравагантны ён толькі для асобаў з кароткай гістарычнай памяццю.

У беларускай палітыцы запанаваў «вялікі расійскі стыль», які брытанскі даследчык Эндру Уілсан калісьці трапна назваў віртуальнай палітыкай. Спектакль, замяшаны на грошах, інфармацыйных тэхналогіях і інсцэнізацыі жахаў і катастрофаў, дробных піяр-акцыях і скандалах, якія падмяняюць змест, сутнасць і мэты.

Пры гэтым інтэлектуальна праекты ў стылі a la Russe нараджаюцца ў самой Беларусі. Адэптаў расійскага палітычнага стылю ў Беларусі заўжды хапала, і абсалютная большасць гэтых людзей — патрыёты Беларусі, якія па-свойму глядзяць на перспектывы краіны і магчымасці выхаду яе з дыктатуры.

Палітычная традыцыя веры ў вызваленчую ролю Расіі ў плане дэмакратызацыі Беларусі мае доўгую гісторыю спадзяванняў, расчараванняў і аднаўлення надзеяў — узгадаем некалі папулярны палітычны слоган «Разам з Расіяй у Еўропу».

Прыхільнікі гэтай палітычнай лініі — людзі пераважна з расійскім бэкграўндам, яны або адтуль паходзяць, або там атрымалі адукацыю і адбыліся як асобы і прафесіяналы, або там працуюць, у тым ліку ў палітычных кампаніях. Менавіта ў гэтым асяроддзі ўзнікалі і папярэднія праекты, якія прэтэндавалі на ўвагу і падтрымку з боку Масквы, аднак амаль ніколі не дамагаліся.

Безумоўна, спадар Уладзімір Някляеў духоўна стаіць у адным шэрагу з Мілінкевічам і Шушкевічам, а не з Сініцыным і Гайдукевічам. Дарэчы, схільнасць старой, можна сказаць БССРаўскай інтэлегенцыі, для якой былы СССР — не чужая зямля, да ўдзелу ў падобных праектах або хоць бы іх блаславення сваёй прысутнасцю для Беларусі таксама традыцыйна.

Чарговы палітычны праект, які, безумоўна, узнік у тым жа асяродку ў Мінску ў 2009 годзе, трапіў у цалкам новы кантэкст, асабліва што тычыцца беларуска-расійскіх зносінаў.

Акурат у той час, калі кіраўнічы тандэм у Крамлі прыйшоў да высновы, што з Лукашэнкам ім больш не дамовіцца, праявілася і новая тактыка паводзінаў Крамля ў блізкім памежжы. Папярэдняя адмаўляла ў магчымасці супрацы з апазіцыйнымі сіламі (акрамя тых, якія выразна стаяць на пазіцыях «расійскага свету»). Аднак у новай парадыгме актыўныя меры па падтрымцы апазіцыі ў Грузіі і Кыргызстане, інспіраванне эканамічнага калапсу і дзяржаўнага перакруту ў тым жа Бішкеку — усё гэта адбывалася ўжо без асаблівай сарамлівасці, а нават з памкненнем засведчыць аўтарства гэтых палітычных праектаў.

Маючы на ўвазе ўсе супадзенні ў часе і стылі (уваход ГОП-кампаніі на беларускі палітычны рынак — праз скупку газетаў і асобаў — тыповы для нашых усходніх суседзяў), выпрацаваць альтэрнатыўную тэорыю паходжання кампаніі было выключна праблематычным (нарэшце, здаецца, прыдумалі беларускую дыяспару ў Расіі, але гэтая версія непераканаўчая, бо апошняя — інтэграваная частка расійскай эліты, і дзейнічаць без узгаднення з Крамлём усё роўна не будзе).

Regime change* у Беларусі на Захадзе проста часова знік з парадку дня, а ў Расіі попыт на такі праект, наадварот, з'явіўся.

Унутраны попыт на праект у стылі a la Russe узнік хіба «па змаўчанні» ў выніку вычарпання традыцыйнага апазіцыйнага рэпертуару. Адбылося масавае расчараванне дэмакратычнага актыву ў папярэдніх намаганнях і іх лідарах. Да таго ж, традыцыйныя заходнія донары амаль у адначассе пакінулі беларускі палітычны рынак, што рэзка знізіла стаўкі традыцыйных палітычных структураў, якія раней гэтымі донарамі падтрымліваліся. Аўтаматычна выраслі стаўкі тых, хто ўмее ствараць «часовыя творчыя калектывы», мозгам якіх служаць каляпалітычныя і інтэлектуальныя сеткі ў Мінску, а мускульнай масай — гурткі і сеткі ў рэгіёнах, якія лёгка перасоўваюцца з партыі ў рух, з руху — у кампанію, з кампаніі — ізноў у партыю ці НДА, часам у нязменным складзе. Менавіта такія творчыя калектывы (глядзіце культавы фільм «Дзень выбараў») і з'яўляліся складнікамі расійскага палітычнага стылю, пакуль там яшчэ існавала канкурэнтная палітыка.

Праблема нават не ў тым, што абсалютная большасць лідараў ГОП-кампаніі арыентуецца на Усход. Праблема ў тым, што кампанія ў стылі a la Russe з пачатку свайго існавання прынцыпова вялася на прынцыпе «свабоды ад каштоўнасцяў», выкарыстоўваючы іх хіба як аднаразовыя сродкі для прыкрыцця сумнеўных палітычных мэтаў.

Можна было адразу на старце бессаромна хлусіць, выдаючы палітычны праект, ад першага кроку накіраваны на прэзідэнцкія выбары, за культурную кампанію. Можна было сімуляваць клопат пра народ праз сумнаявдовыя паштоўкі з заклікам пісаць праўду-матку «на деревню батьке», цудоўна ведаючы, што практычна ніхто іх нікуды не пашле. Можна было зноў, другі раз запар, выкарыстаць імя Васіля Быкава, гэтым разам з асаблівым цынізмам. Казулін хоць збор твораў выдаў, а тут подпісы банальна скарыстаюць як базу дадзеных, каб хутчэй дапаўзці да запаветных ста тысячаў.

Ветэраны мясцовых паліттэхналогій, адказныя за ганебную чыстку палітолагаў у Еўрапейскім гуманітарным універсітэце, амаль непрыкрыта хваляцца студэнтам, колькі газетаў у сваім рэгіёне яны скупілі, і выкарыстоўваюць свае офісы для рэкрутынгу новых наймітаў.

Наогул, «свабода ад каштоўнасцяў», карыстаючыся веберaўскай тэрміналогіяй, — фундаментальны прынцып расійскага палітычнага стылю. Узгадваецца мае кантакты з некаторымі маскоўскімі паліттэхнолагамі, якія спрабавалі зарэкрутаваць мяне ў арганізацыю моладзевых лагераў па прынцыпе расійскага Селігера для «Нашых». Заўлены крытэр адбору быў акурат такі — удзельнікі не мусяць зацыкліваца на каштоўнасцях, таму што з гэтымі людзьмі «нельга дамовіцца». Пра каштоўнасці прыхільнікі стылю a la Russe узгадваюць, хіба калі трэба адбіцца ад насмешак за чарговыя праваленыя піяр-акцыі.

Дарэчы, пра піяр. На бяду для ГОП-кампаніі, амаль кожны публічны выступ яе лідара заканчваецца публічным фіяска, пасля якога застаецца ці апраўдвацца, ці пераводзіць стрэлкі на пытанні, якія пару тыдняў таму ніхто і не ўздымаў.

Такой бязглуздай, непрафесійнай, неахайнай працы з кандыдатам не было ў папярэдніх апазіцыйных кампаніях (скажам, таго ж Ганчарыка ў 2001 годзе).

Тут ёсць адна канцэптуальная праблема. Стыль a la Russe (раскруцім хоць палена, былі б інфармацыйныя рэсурсы) — гэта стыль хутчэй улады, чым апазіцыі, ён рэалізуецца пры татальным або амаль поўным кантролі над інфармацыйным полем.

Аднак у палітыцы пераможцаў не судзяць, і калі б палітычны праект у стылі a la Russe меў бы хоць нейкія шанцы на поспех, то паводзіны яго адэптаў знайшлі б апраўданне. Праблема ж менавіта ў тым, што праект зляплены цапу-лапу і па ўсіх сваіх складніках, акрамя фінансавага, прайграе нават папярэднім апазіцыйным патугам, і выдзяляецца цяпер з агульнай апазіцыйнай масы толькі дзякуючы татальнаму «разброду і шатанню» ў яе стане.

Стваральнікі праекта ў стылі a la Russe зрабілі выбар на карысць горшага ў параўнанні з дрэнным — самай правальнай апазіцыйнай стратэгіі з магчымых. Ці не маглі яны не разумець, што праект правальны, што ён аўтаматычна гарантуе Лукашэнку элегантную перамогу, «вызваляючы» для яго незалежніцкі фланг? Ці не маглі яны не разумець, што пачынаць перадвыбарчую кампанію ў Маскве — значыць загадзя пацвердзіць праўдзівасць у вачах абывацеля ўсё, што на вас выльецца з БТ?

Мяркуючы па якасці інфармацыйнай атакі на Лукашэнку з боку Расіі, усіх гэтых «Хросных бацькоў», у Маскве таго не разумелі. Але вось нашыя адэпты наўрад ці мелі хоць нейкія ілюзіі наконт свайго кандыдата.

Калі толькі ўся кампанія рабілася насамрэч далёка не пад Някляева... Як так? Ды вельмі проста, узгадайце яшчэ адну даўнюю песню, якой і раней спрабавалі прыцягнуць увагу палітычных інвестараў з усходу. Маецца на ўвазе праект «здачы» Лукашэнкі пануючай наменклатурай. Маўляў, нехта з высокапастаўленых чыноўнікаў перабяжыць у лагер апазіцыі і ўзначаліць кампанію.

Аднак перавабіць высокапастаўленых чыноўнікаў у стан апазіцыі не ўдалося, не ўдалося і «прадушыць» прызначэнне на пасаду прэм'ера асобы, якая б задавальняла Маскву (а магчыма, і не толькі яе) у якасці будучага пераемніка, якому б, у разе чаго, перайшла б улада. (Паводле маіх звестак, Масква дабівалася прызначэння на пасаду прэм'ера Уладзіміра Макея.)

Такім чынам, выглядае, што Лукашэнку ўдалося і на гэты палітычны цыкл захаваць адзінства наменклатуры, і ўпершыню ён пойдзе на прэзідэнцкія выбары як яе лідар, а не проста як наглядчык у чыноўнічым бараку.

Але што цяпер, калі палітычны праект нехта паспрабуе давесці да розуму? Калі перамога на выбарах немагчыма, верагодны шлях працы на дэлегітымізацыю выбараў, а гэта значыць, што кампанія ў стылі a la Russe можа стаць фігурантам ужо расійскай паліттэхналогіі — назавём яе ўмоўна «падрыў дамоў у Маскве».

Ці не запісаныя загадзя лідары ГОП-кампаніі ў палітычныя пакутнікі тымі, хто зрабіў на іх стаўку? Зрэшты, яшчэ больш магчымыя контрмеры ўлады «на апярэджанне» ў тым самым стылі, пагатоў што элементы расійскага сцэнару-1999 (аналагі праграмаў тыпу «Аднак») ужо пачалі з'яўляцца ў эфіры.

Пры наяўнасці рэсурсаў на другое месца можна раскруціць што заўгодна і каго заўгодна. Але дасягнуць большага, дасягнуць перамогі — не проста цяжэй. Далей спатрэбіцца ўсё тое, што нішчылася дзеля другога месца і што не пасуе стылю a la Russe — прынцыпы, каштоўнасці, адданасць.

Купіць Плошчу супраць уладара ў бронекамізэльцы не ўдасца. Я не кажу, што Някляеў і ГОП-кампанія безнадзейныя. Але для гэтага яны мусяць перарасці з неахайнага піяр-праекта, скіраванага на другое месца на палітычным небасхіле, у нешта большае. А гэта цяжкая задача.

* Regime change — змена рэжыму (анг.)

*Артыкулы на паласе «Каментары» могуць супадаць, а могуць і не супадаць з меркаваннем Рэдакцыі.*

# Дзед Талаш вяртаецца

**На «Беларусьфільме» пачынаюць здымкі чатырохсерыйнай тэлестужкі паводле аповесці Якуба Коласа «Дрыгва».**

— Пад Смалявічамі пабудаваныя дэкарацыі, — кажа рэжысёр фільма Сяргей Шульга. — Чакаем бабінага лета, каб зняць летнюю натуру. Акрамя гэтага, сёлета здымем баль у Пружанскім палацыку і тамсама — зімовыя баі.

Акторскі склад для фільма «Талаш» ужо вызначаны — гэта ў асноўным акторы Купалаўскага і Горкаўскага тэатраў.

Настасся Баброва здымецца ў ролі Аўгінні, а Андрэй Крывецкі — у ролі Макара. Задзейнічаныя «зубры» Купалаўскага Аўгуст Мілаванаў і Генадзь Аўсяннікаў.

Дзеда Талаша будзе граць народны артыст Беларусі Генадзь Гарбук. Паводле сцэнара, працістаяць яму будзе Сцяпан, яго сыграе актор Купалаўскага Павал Харланчук.

У стужцы беларусы будуць размаўляць па-беларуску, палякі — па-польску, а бальшавікі, адпаведна, — па-расійску.

— Паляшуцкай гаворкі, на якой гаварыў дзед Талаш і яго аднавяскоўцы, у стужцы, на жаль, не будзе, — працягвае аповед спадар Шульга. — Мы прыйшлі да высновы, што стужка павінна быць зразумелая большаму колу гледачоў, таму абралі класічны варыянт беларускай мовы, а не яе дыялект. У дадатак, я быў супраць трасянкі — беларускую мову трэба вяртаць.

Шульга, які са згоды сына Якуба Коласа Міхася Міцкевіча напісаў сцэнар «Талаша», не раскрывае ўсіх суплётаў сюжэта фільма. Але вядома, што да тэмаў Першай сусветнай і савецкапольскай вайны 1918—1920 гг. дадаўся любоўны трохкутнік, якога не было ў коласаўскай «Дрыгве». Будуць сцэны з гістарычнымі постацямі, у прыватнасці, з правай рукой Пілсудскага, камісарам па Беларусі Ежы Асмалоўскім.

Нягледзячы на запрошаную каскадзёрскую групу і здымкі трох вялікіх баёў, рэжысёр «Талаша» лічыць, што гэта будзе хутчэй псіхалагічнае кіно, дзе вайна прысутнічае як фон, як цяжкія абставіны, што прымушаюць людзей рабіць выбар.

— Асноўнай тэмай зробіцца беларуская незалежнасць, прага людзей да самастойнасці, — кажа Шульга. — У стужцы Макар Балук, камандзір партызанскага атрада, выказвае думку: «Давайце самі будзем ваяваць за сябе, супраць і тых, і тых», але больш разважлівы дзед Талаш адказвае: «Не, не здужаем, сілы ў нас замала, трэба вызначацца — выбіраць чыйсьці бок. Бо калі самі пойдзем, і тыя, і гэтыя сатруць нас на парашок».

**Асноўнай тэмай «Талаша» зробіцца беларуская незалежнасць, прага людзей да самастойнасці. Макар Балук, камандзір партызанскага атрада, выказвае думку: «Давайце самі будзем ваяваць за сябе, супраць і тых, і тых», але больш разважлівы дзед Талаш адказвае: «Не, не здужаем, сілы ў нас замала, трэба вызначацца — выбіраць чыйсьці бок. Бо калі самі пойдзем, і тыя, і гэтыя сатруць нас на парашок».**

Тэлестужку «Талаш» павінны скончыць у канцы мая 2011-га. Потым яе, хутчэй за ўсё, пакажуць па беларускіх каналах. Рэжысёр дадае, што будуць падрыхтаваныя ўсе ўмовы, каб у выпадку поспеху тэлефільма зрабіць з яго паўнавартасны мастацкі фільм.

**ПК**

# Дзед Талаш супермен

Ніякі іншы літаратурны герой так не паўплываў на фармаванне іміджу Беларусі партызанскай, як дзед Талаш — жыхар палескай вёскі Навасёлкі, удзельнік савецкапольскай і Другой сусветнай войнаў.

### Евангелле паводле Якуба

Калі б не было аповесці «Дрыгва», не было б і дзеда Талаша. Цяпер ужо цяжка сказаць, быў гэты твор дзяржзамовай ці Колас маляваў вобраз дзеда ад шчырага сэрца. Так ці гэтак, але аповесць «Дрыгва» дала магутны штуршок цэлай «Талашыядзе»: успаміны паплечнікаў Талаша, партрэты, опера «У пушчах Палесся». Не толькі беларусы: расійскія паэты Аляксей Суркоў і Сяргей Новікаў-Прыбой пішуць дзеду Талашу свае оды.

Малады кампазітар Анатоль Багатыроў у 1940 г. атрымаў за «У пушчах Палесся», -- але ўжо оперу, -- Дзяржаўную прэмію. Пастаноўку паказалі ў Бальшым тэатры ў Маскве. Кажуць, пасля прагляду Сталін сказаў: «Вось як трэба пісаць музыку!» — і запрасіў кампазітара да сябе.

### Карл Маркс на кані з шашкай

Падчас Другой сусветнай вайны аж два скульптуры ляпілі дзеда з натуры. На пытанне Заіра Азгура, якім Талаш бачыць свой помнік, паляшук адказаў: «Як Карла Маркса! І абавязкова верхам на кані з шашкай».

А вось што Талаш дапісаў да сваёй біяграфіі: «Да сваёй заявы дадаю, што партызанам я ў час наступу палякаў у 1920 г. зрабіўся не таму, што быў палякамі пакрыўджаны, што яны забралі ў меня сена, а потым, што ў мяне адклалася неабходнасць абароны Радзімы...»

Дзед разумеў: герой — гэта той, хто пайшоў ваяваць свядома, а не пад ціскам абставінаў.

### Хаджэнні ў мастацтва

Калі ў Мінску ставілі оперу «У пушчах Палесся», дык Талаш прысутнічаў на рэпетыцыях і нават падказаў мастаку афармленне сцэны. Мікалай Жыгоцкі ў сваёй кнізе «Легендарны дзед» расказвае, нібыта Васіль Ісакавіч дужа здзіўляўся, што ў жыцці ён пяе не так шмат, а тут актор, які грае яго, спявае амаль кожнае слова.

Увогуле, дзед за абвяшчэнне яго ўсенародным героем патрабаваў адпаведнага стаўлення. Захавалася запіска начальніка абласнога УНКВД В.Проніна на імя сакратара ЦК КПБ Рыгора Эйдзінава, датаваная 18.7.1941: "Васіль Талаш пагадзіўся ўступіць у партызанскі атрад толькі пасля таго, як яму далі гектар зямлі".

Пасля кароткага партызанства Талаша адправілі ў Маскву. Дзед жыў у гасцініцы «Якар». Гэта быў яго зорны час. Менавіта тады зроблены знакаміты здымак з Якубам Коласам. Вось што піша Заір Азгур: «Хадзіў па Маскве дзед Талаш у кажушку, у шапцыаблавушцы. Крочыў па вуліцах і плошчах па-гаспадарску... Галава горда ўзнятая. Чалавек, які прывык, што яго пазнаюць і паважаюць іншыя. Як у Петрыкаве...».

### Дзед is not dead




Па-ранейшаму дзейнічае музей Талаша ў вёсцы Навасёлкі. Паранейшаму бронзавая вінтоўка дзеда Талаша — адзін з самых «намоленых» помнікавых элементаў у беларускай сталіцы.

Узнікла серыя анекдотаў пра двубой Арнольда Шварцэнегера з дзедам Талашом. У анекдотах супермэнам з іх суперзброямі дзед дае дыхту сякерай. Не без уплыву вобраза дзеда ў сецiве друкуюць кітч-карцінкі з выявамі барадатых партызанаў. У 1997 годзе першы беларускамоўны інтэрнэтпартал — о, дзіва — быў названы — як бы выдумалі?

І калі ласка — на «Беларусьфільме» будуць здымаць тэлесерыял паводле «Дрыгвы». Вось так, на 166-м годзе жыцця, дзед Талаш ізноў прызваны на вайну.

**Ліза Кавальчык**

## Сцісла

• **Латушка дабіваецца ад літоўцаў аднаўлення музея Луцкевіча.** Міністр культуры Літвы Арунас Гелунас асабіста зоймецца праблемай аднаўлення Віленскага беларускага гісторыкаэтнаграфічнага музея імя Івана Луцкевіча. Як адзначыў у сваю чаргу беларускі міністр культуры Павел Латушка, літоўскаму боку прапанавана вырабіць за кошт Беларусі лічбавыя копіі тых матэрыялаў музея імя Луцкевіча, якія захоўваюцца ў розных установах культуры Літвы. Музей існаваў у 1921–1945 гадах на аснове прыватнай калекцыі нашаніўца, гісторыка і археолага Івана Луцкевіча. Пасля закрыцця ў 1945 годзе большая частка яго збораў перададзена музеям Літвы, астатняе — музеям Беларусі.

• **У Беларусь прыедзе нашчадак Агінскага.** 70-гадовы кампазітар Іва Залускі прыме ўдзел у канцэртах «Музыка дынастыі Агінскіх» у Гродне і Мінску. Піяніст спецыяльна прыляціць з Вялікабрытаніі, каб удзельнічаць ва ўрачыстасцях з нагоды 245-годдзя свайго вядомага прашчура. 8 кастрычніка Іва Залускі разам з музыкантамі з Літвы і Беларусі выступіць у Гродне. На наступны дзень запланаваны канцэрт у Мінску. Музычныя вечары адбудуцца ў рамках вялікай адукацыйна-канцэртнай праграмы «Шлях паланезаў Міхаіла Клеафаса Агінскага-2010».

• **Беларусы прэтэндуюць на Нобеля.** Але прэтэндэнцтва мае фармальны характар. Беларусы, якія высоўваліся на атрыманне прэміі ў ранейшыя гады, застаюцца ў спісе кандыдатаў (за выключэннем памерлых). А значыць, у спісе прысутнічаюць Рыгор Барадулін і Святлана Алексіевіч. Хаця поўны пералік застаецца засакрэчаным, вядома, што сёлета ў яго ўвайшоў семдзесят адзін пісьменнік. Вялікія шансы атрымаць Нобеля па літаратуры маюць палякі, літаратуру якіх прадстаўляе Адам Загаеўскі. Яго імя брытанская букмекерская кампанія Ladbrokes называе ў ліку іншых імаверных пераможцаў — Томаса Транстрэмера са Швецыі, Ко Ун з Паўднёвай Карэі, сірыйца Алі Ахмад Саіда. Пераможца ўжо абраны. А 7 кастрычніка адбудзецца фармальнае галасаванне.

• **Акудовіч: усе палітыкі – курдупелі.** 29 верасня ў кнігарні «Ў» адбылася прэзентацыя новай кнігі Валянціна Акудовіча «Архіпелаг Беларусь». Пад вокладкай чытач




знойдзе дыялогі, фрагменты гутарак, дыскусіі ды палемік, у якіх аўтар браў удзел цягам апошніх пятнаццаці гадоў. Спадар Акудовіч кажа, што з усяго нагаворанага і напісанага ім сюды ўвайшло ўсяго адсоткаў 20. Адзін з самых цікавых раздзелаў прысвечаны палітыцы. Акудовіч прызнаўся, што палітыку не любіць: «Усе палітыкі — гэта курдупелі, якіх цудоўная фея падае як прыгажуноў». І гэтай тэме прысвечаны невялікі тэкст, які так і называецца — «Пастамент для курдупеля».

**КМ**

Рагнеда Аляхновіч — дачка «ворагаў народа». Яе бацька ўзначальваў беларускі ўрад на выгнанні, а маці рэпрэсавалі за нацыяналізм. У савецкія часы гэтага было дастаткова, каб цалкам «выпасці» з жыцця.

# Савецкая дачка прэзідэнта БНР

Яна — дачка Вінцэнта Жук-Грышкевіча і Ксені Лапіцкай. Бацьку савецкія карныя органы забралі, калі ёй было восем гадоў. Калі было трынаццаць — арыштавалі маці. У вайну адзін дзядзька — святар Мікалай Лапіцкі — выехаў на эміграцыю, іншы дзядзька — Іван Касяк — працаваў у Беларускай народнай самапомачы ў часе акупацыі, а пасля стаў палітэмігрантам. Як у такіх перыпетыях складаўся лёс спадарыні Рагнеды? Яна пра тое не ахвочая расказваць. Вядома, што за ўтойванне фактаў з біяграфіі ў 1951-м яе выключылі з універсітэта.

...Калі ў 1939 годзе камуністы прыйшлі ў Заходнюю Беларусь, Рагнеда была на вакацыях у сваякоў на Дзісеншчыне. «На пачатку верасня туды прыехала мама. Там мы і «вызваліцеляў» — Чырвоную армію — сустрэлі. А дадому, у Вільню, вярнуліся, калі там ужо гаспадарылі літоўцы (Сталін аддаў ім горад). Навучанне ва ўніверсітэце (мама была на пятым курсе агранамічнага факультэта) перавялі на літоўскую мову. Давялося ехаць ва Украіну, дзе яна скончыла агранамічны факультэт Львоўскай політэхнікі. Працавала аграномам на Львоўшчыне. «Там нас і заспела «Айчынная» вайна, — прыгадвае спадарыня Рагнеда. — Вядома, скрушныя часы лягчэй перабываць сярод родных. Мама паходзіла з вёсачкі Засценкі каля Іжы (Вілейшчына). Таму, набыўшы з дапамогай Украінскай самапомачы патрэбныя дакументы, мы накіраваліся — дзе падводай, а дзе і цягнікам — у Вілейку».

Ішоў 1944 год. Муж ваяваў у Італіі, пад Монтэ-Касіна. Але Ксеня Грышкевіч наўрад ці што ведала аб яго лёсе. Трэба было самой вызначацца з далейшым жыццём: падавацца на захад альбо чакаць прыходу камуністаў. Вырашыла ўцякаць. Ад'язджалі, як успамінае спадарыня Рагнеда, ці не апошнім цягніком — на адкрытай платформе. Але дабраліся толькі да Вільні: Рагнеда захварэла на ангіну.

«Пакуль я хварэла, мама праводзіла ў нявedamы свет сваёго роднага брата, святара Мікалая Лапіцкага з сям'ёй, стрыечнага брата Івана Касяка. Мы перачырвалі ў Вільні савецкія ды нямецкія бамбёжкі, хаваліся з іншымі людзьмі ў сутарэннях, дзе мама, як магла, закрывала мяне сабою». Зноў вярнуліся ў Вілейку. Прытуліліся ў старой лазні. Дом, у якім раней мелі пакой, згарэў. Ксеня Грышкевіч пайшла працаваць у Абласны зямельны аддзел. У адзін жнівеньскі дзень яе з працы прывялі двое вайскоўцаў. Зрабіліператрус. І забралі жанчыну. На адыходзе яна паспела сказаць дачцэ: «Я еду ў камандзіроўку. А цябе забярэ цётка Ніна». Але Рагнеда зразумела, што гэта была за камандзіроўка.

Некалькі дзён дзяўчынка прабыла ў лазні. Потым малодшая сястра маці забрала яе да сябе ў Іжу. Сваякі вырашылі Рагнеду вучыць. Нанялі для яе ў Вілейцы кватэру, падвозілі харчы. Так пачалася савецкая школа. З раніцы яна хадзіла на ўрокі, а пасля заняткаў — з перадачай для маці — да турэмных муроў.

«Аднойчы, стоячы ля агароджы, я пабачыла маму. Яе вялі два энкавэдысты. Праходзячы каля мяне, яна ціха сказала: «Не плач. Ідзі дамоў. Я скора вярнуся». Яшчэ адзін раз бачыла маму ў пачатку зімы. Арыштаваных ужо трымалі ў будынку турмы, а не ў прыбудове да яе, як да гэтага. Каб пабачыць чалавека, калі ён знаходзіўся ў адной з камер на другім паверсе, трэба было перайсці на процілеглы бок вуліцы і паглядзець уверх, на вокны вязніцы. Я так і зрабіла. Праз колькі часу я пабачыла маму. Яна ўзнімала ў руках клуначак, які я перадала. Потым адкілала яго, згарнула рукі так, нібы мяне абдымала. Але турэмныя вокны закрылі шчытамі. Нават такой уцехі я больш не мела».

> З раніцы яна хадзіла ў школу, а пасля заняткаў у турму — з перадачай для маці.

У лютым перадачы пачалі вяртаць. Маўляў, маці выбыла на этап. Рагнеда чакала вестак. Не дачакалася. Значна пазней ёй паведамілі, што падчас эпідэміі тыфу ў вязніцы маці памерла. І «брацкую» магілу паказалі на вілейскіх гарадскіх могілках.

«Ля самай агароджы — парослая зжаўцелай травою пустка. Крыху ўзбоч — столік і лаўка, фарбаваныя ў блакіт. Я паклала на сцэрхлую траву белыя і чырвоныя хрызантэмы — праз дзясяткі гадоў першыя кветкі на магілу маці. Памалілася за супакой душаў слугі Божае Ксені і ўсіх, хто спачывае ў гэтай братэрскай магіле».

Праз дзень, калі яна зноў прыйшла да магілы, не пазнала яе ўжо. «Трава была скошана і прыбрана, зніклі мае кветкі. Стала крыўдна, горка».

А ў 1945 годзе Рагнеда яшчэ хадзіла ў школу і спадзявалася на вяртанне маці. Са школьнага жыцця яна ўзгадвае выпадак, калі адміністрацыя паспрабавала арганізаваць вечар пытанняў і адказаў, у савецкім духу. «Свае цыдулкі мы мусілі кідаць у спецыяльную скрыню. Але гэты вечар так і не адбыўся. Бо ці ж можна было ў тыя часы даваць тлумачэнні на запыты кшталту: «Раскажыце, калі ласка, пра Залаты век на Беларусі». Многія ў час акупацыі вывучалі гісторыю па падручніках Вацлава Ластоўскага. Справа, вядома, магла скончыцца ў засценках НКВД, але нашы педагогі ёй ходу не далі».

Яшчэ ў трынаццаць гадоў Рагнеда Грышкевіч захапілася паэзіяй. Да 10 класа ў яе назбіраўся цэлы сшытак з вершамі і паэмай пра казацкае паўстанне на Беларусі. Школьніца не мела з кім парaіцца наконт сваёй творчасці і таму вырашыла звярнуцца адразу да Якуба Коласа.

«Мілая, слаўная Рагнеда! — пісаў народны паэт дзяўчыне. — Толькі што прачытаў Вашу паэму, асноваю якой паслужыла для Вас народнае паданне... Сшытак з «Таямніцай руін» я перасылаю Вам. Калі Вы на яго глянеце, то пабачыце, як многа ў ім чырвоных рыс. Падчыркнута ўсё, што трэба правіць. ...Але не з повады гэтых недахопаў я пішу Вам — у пільнай рабоце над сабою гэтыя недахопы будуць лёгка зжыты — мне было прыемна і радасна прачытаць». Такога адказу школьніца і не чакала. Затым былі яшчэ лісты ад Якуба Коласа. Што стала з паэмай і вершамі Рагнеды?

«Сшытак з маёй паэмай «Таямніцы руін» у мяне ўкралі ў студэнцкім інтэрнаце. І яго мне вельмі шкада, бо там былі праўкі, зробленыя Коласавай рукой. Калі мець на ўвазе, што ў 1951-м годзе пасля 3 курса мяне з універсітэта выключылі як дачку рэпрэсаваных, то няцяжка здагадацца, у архівах якой установы гэты сшытак, магчыма, і цяпер знаходзіцца».

З 1948 года Рагнеда Грышкевіч вучылася на беларускім аддзяленні філфака БДУ. Але як выключылі з універсітэта, на творчасці паставіла крыж. Скончыць ВНУ змагла толькі пасля смерці Сталіна, завочна. У біяграфічным апавяданні «Воўк прагне крыві» Вячаслаў Адамчык успамінаў выпадак з выключэннем Рагнеды як «маё першае, найбольш балючае адчуванне непарушнага, абвеянага пакорным страхам, сталінскага рэжыму, які неспатолена прагнуў чалавечай крыві».



**Рагнеда Аляхновіч (Грышкевіч)**

нар. у 1931 у Вільні. Дачка старшыні Рады БНР Вінцэнта Жук-Грышкевіча і рэпрэсаванай Ксені Лапіцкай. За ўтойванне фактаў біяграфіі аб бацьках была выключаная з БДУ ў 1951. Скончыла філфак пасля смерці Сталіна. Выкладала беларускую мову і літаратуру, працавала ў НДІ педагогікі.

...Рагнеда Аляхновіч прысвяціла сваё жыццё выкладанню роднай мовы і літаратуры. Ад настаўніцы да старшага навуковага супрацоўніка НДІ педагогікі — такі яе працоўны шлях. На пенсіі — з 1987 года. Бацька некалі раіў ёй замест філалогіі выбраць медыцыну. Але дачка не паслухалася. І, як сама прызнаецца, не шкадуе. А няспраўджаная натура паэта рэалізавалася ў дапаможніках — па творчасці Янкі Брыля і беларускай літаратуры ў школе.

**Сяргей Макарэвіч**

ЭПІЗОДЫ ГІСТОРЫІ

# Як у Мінску Жырыноўскага білі

19 гадоў таму ў беларускім парламенце Уладзіміра Жырыноўскага спусцілі з лесвіцы.

У Маскве ніколі не ўяўлялі сабе, што беларусы здольныя адстойваць незалежнасць. Адной з першых ахвяраў гэтай ілюзіі стаў скандальны расійскі палітык Уладзімір Жырыноўскі — заўсёдны рупар таго, што афіцыйны Крэмль хоча ўкласці ў вушы, але не можа сказаць простым тэкстам.

Жырыноўскі з'явіўся ў Мінску неўзабаве пасля абвяшчэння незалежнасці.

У будынку беларускага парламента ішла сесія Вярхоўнага Савета. «У часе перапынку чую вэрхал на лесвіцы каля кабінета апазіцыі, — апавядае Лявон Баршчэўскі, дэпутат Вярхоўнага Савета XII склікання. — Бачу: ляціць Жырыноўскі зверху і падае мне пад ногі. Пятро Садоўскі і Сяргей



Навумчык спусцілі яго з лесвіцы».

Уладзімір Жырыноўскі з'явіўся без запрашэння, патрабаваў сустрэцца са старшынёй парламента або членам прэзідыума. «Ён спрабаваў прайсці ў Вярхоўны Савет, паказваючы сваё пасведчанне старшыні партыі, але без пячаткі», — успамінае Пятро Садоўскі, член прэзідыума. Дзяжурны міліцыянер па тэлефоне папрасіў дапамогі, каб утаймаваць напорыстага госця. «Вы нязнаёмы грамадзянін, я не магу вас прапусціць», — адказваў на закіды візіцёра Пятро Садоўскі, хоць і пазнаў маскоўскага палітыка. Старшыня ЛДПР крычаў: «Я хачу прайсці!»

На дапамогу падаспеў дэпутат Сяргей Навумчык, каардынатар парламенцкай апазіцыі БНФ.

Пачуўшы прозвішчы Навумчык і Садоўскі, Вольфавіч паабяцаў вярнуцца на танку і пакараць усіх «жыдоў і палякаў», што развальваюць вялікую краіну. Ён крычаў: «Усю вашу шляхту перавешаю ўздоўж дарогі да Смаленска!»

Жырыноўскі планаваў вечарам таго ж дня правесці мітынг ля Палаца спорта на Нямізе. Беларускае згуртаванне вайскоўцаў на чале з падпалкоўнікам Мікалаем Статкевічам не дало яму гэтага зрабіць.

«Хоць тады сапраўды сабралася дастаткова шмат прыхільнікаў Жырыноўскага — тысяча, паўтары, — але калі патрыятычная моладзь падышла да Жырыноўскага і адцясніла ахову, ён кінуўся наўцёкі», — узгадвае Мікалай Статкевіч.

Беларускія вайскоўцы без гвалту накіравалі маскоўскага госця да гатэля.

«У Маскве не маглі паверыць, што беларусы хочуць незалежнасці, што існуюць рэальныя сілы, здольныя абараняць суверэнітэт краіны. Жырыноўскі быў кінуты сюды як пробны камень».

Пасля няўдалага мітынгу Жырыноўскі ціха з'ехаў. Злыя языкі кажуць, што сядаў Уладзімір Вольфавіч у цягнік не з платформы, дзверы для яго адмыслова адчынілі з адваротнага боку — каб ніхто не пабачыў.

**Юльян Місюкевіч**

# Арамнаў пракурыў Алімпіяду

21 верасня Дысцыплінарная камісія федэрацыі цяжкай атлетыкі разглядала справы трох беларускіх спартоўцаў. Усе яны былі злоўленыя на ўжыванні забароненых прэпаратаў падчас красавіцкага чэмпіянату Еўропы ў Мінску.

Мікалай Чэрняк быў бронзавым прызёрам таго першынства. У ягонай крыві ў антыдопінгавым агентстве знайшлі прэпарат правірон. Гэты сродак прымяняецца перад спаборніцтвамі для павышэння жорсткасці мускулатуры. Ён часта прымяняецца акцёрамі ці спевакамі перад здымкамі, каб падкрэсліць мускулатуру.

Па гэтым выпадку беларусы не змаглі нават апраўдвацца. Вердыкт — 4 гады дыскваліфікацыі.

Яшчэ адна бронзавая медалістка кантынентальнага чэмпіянату Шэмшат Туляева трапілася на ўжыванні кленбутэролу. Часта ён выкарыстоўваецца для спальвання тлушчу. Для цяжкаатлетаў гэта вельмі актуальна перад спаборніцтвамі.

Шэмшат настойвала на тым, што прэпарат яна атрымала ў кроплях ад прастуды. Але не дапамагло. Дзяўчына атрымала максімальную дыскваліфікацыю — 4 гады.

Туляева родам з Туркменістана, але як спартсменка склалася ўжо ў Беларусі.

Самы дзіўны выпадак быў з алімпійскім чэмпіёнам Андрэем Арамнавым. Ён пагарэў нават не на злоўжыванні допінгу, а на тым, што паліў марыхуану.

У прынцыпе, паленне гэтага наркотыку забаронена толькі падчас спаборніцтваў. І беларускі бок настойваў на тым, што Арамнаў ужываў марыхуану задоўга да стартаў. Камісія магла абмежавацца толькі папярэджаннем, але вынесла ці не самае суровае ў дадзеным выпадку пакаранне — шэсць месяцаў дыскваліфікацыі.

А гэта значыць, што Арамнаў прапусціць Алімпіяду ў Лондане. Бо ўсім цяжкаатлетам, якія атрымліваюць паўгадавую ці большую дыскваліфікацыю забаронены ўдзел у Гульнях. Канечне, беларусы будуць аспрэчваць гэтае рашэнне, але невядома, ці прыняе гэта вынік.



Андрэй Арамнаў — чалавек складанага характару. Маючы фантастычны прыродны талент, Арамнаў робіць усё магчымае, каб яго разбазарыць. Колькі разоў яго ўжо лавілі п'яным за стырном машыны. Цяпер вось новы скандал з марыхуанай.

Такіх спартоўцаў складанага лёсу вельмі любяць заўзятары. Можна ўзгадаць хаця б футбаліста Аляксандра Пракапенку. Зрэшты, у Арамнава яшчэ ёсць час, каб рэалізаваць свой грандыёзны патэнцыял.

**Зміцер Панкавец**

КОЛЫ

## Указ аб відэафіксацыі ўвойдзе ў сілу 6 кастрычніка

Як паведамляе ДАІ, якасць відэафіксацыі высокая, будзе добра распазнавацца не толькі нумар і марка аўто, але і твар кіроўцы. Пасля таго як здымак будзе апрацаваны і супрацоўнікі ДАІ вызначаць уладальніка аўтамабіля, яму будзе накіравана раздрукоўка выявы з указаннем часу, месцы фіксацыі і самога транспартнага сродку. Пасля вынясення пастановы аб прыцягненні да адміністрацыйнай адказнасці папера павінна быць накіравана ўласніку аўтамабіля.

Калі высветліцца, што ў момант парушэння правілаў дарожнага руху ўладальнік з нейкіх прычынаў не распараджаўся транспартным сродкам або аўтамабіля ў яго проста не было з прычыны злачыннага дзеяння (напрыклад, угону), законны ўладальнік павінен напісаць заяву, якая тычыцца таго, што ў момант праваправарушэння аўтамабілем кіраваў не ён.

**БЕЛТА**

## ДАІ рэкамендуе «пераабувацца» ў зімовую гуму

Гэта звязана з пахаладаннем. Усім кіроўцам у ДАІ парэкамендавалі праверыць, наколькі машына гатовая да халоднага сезона.

Трэба не толькі замяніць летнюю гуму на зімовую, але і праверыць спраўнасць тармазоў, фараў, шклоачышчальнікаў, прылады абагравання і абдзімання шкла. Акрамя таго, ДАІ раіць выбіраць больш стрыманы стыль кіравання на вільготнай і заледзянелай дарозе, пазбягаць выезду на паласу сустрэчнага руху, рэзкіх разгонаў і тармажэнняў. Пешаходам варта памятаць, што аўтамабіль нельга спыніць імгненна.

**БЕЛТА**

ТЭХНАЛОГІІ



## Новы від транспарту — веламонарэйка

Кампанія Google будзе спонсарам стварэння новага віду грамадскага транспарту — веламонарэйкі. Першая з іх павінна з'явіцца ў ЗША цягам некалькіх гадоў. У якім горадзе — пакуль камерцыйная таямніца. Кампанія Google выдаткавала мільён даляраў на распрацоўку праекта.

Веламонарэйкі — гэта падвясная дарога з аднамясцовымі кабінкамі з педалямі. Рухаецца кабінка па тым жа прынцыпе, што і ровар. Хуткасць таксама цалкам залежыць ад кіроўцы. У свеце такі від грамадскага транспарту ўжо існуе — як забаўка ў адным з паркаў Новай Зеландыі, кошт паездкі — 35 даляраў. Але прадстаўнікі Google разлічваюць зрабіць з веламонарэйкі новы від грамадскага транспарту. Асноўным плюсам праекта лічыцца яго экалагічнасць.

**ЮУ**

У МЕРУ

## Названы найлепшыя віны ў свеце

У Лондане ў рамках самага прэстыжнага віннага конкурсу International Wine Challenge эксперты вызначылі найлепшыя віны ў свеце. Сярод чырвоных такім прызнанае віно маркі Brunello di Montalcino Riserva ўраджаю 2004 года. Гэта італьянскае віно, што робіць у італьянскім рэгіёне Таскана ў вельмі абмежаваным аб'ёме. Найбольшая колькасць узнагарод дасталася Францыі (21 віно), за ёй ідзе Аўстралія (12) і Партугалія (11). Усяго ў конкурсе «брала ўдзел» больш як 10 000 марак.

Таксама ў лідары выйшлі Samling Trockenbeerenauslese 2007 года — найлепшае дэсертнае віно, Charles Heidsieck Millésime 2000 года — найлепшае пеністае віно, Puligny Montrachet 1/er Cru Les Chalumeaux 2007 года — найлепшае белае віно.

**ЮУ**

ЗДАРОЎЕ

Еўракамісія прапануе ўсім еўрапейскім вытворцам тытунёвай прадукцыі праілюстраваць цыгарэтныя пачкі фотаздымкамі ўнутраных органаў, пашкоджаных нікацінам. Чатыры краіны Еўропы ўжо друкуюць шакуючыя выявы на цыгарэтах — Бельгія, Румынія, Вялікабрытанія і Латвія.

Джон Далі, еўракамісар па пытаннях аховы здароўя, зазначыў, што, нягледзячы на вельмі высокія кошты і патэнцыйную небяспеку, 30% еўрапейцаў працягваюць паліць. Ад гэтага расходы на сістэму аховы здароўя растуць.

Як даказалі псіхолагі, шок-фоты як метад уздзеяння нашмат эфектыўнейшыя за надпісы, што з'яўляюцца на пачках.

**korrespondent.net**



**Шок-фоты з'явяцца на цыгарэтных пачках.**

КАЛЬКУЛЯТАР

## 1 700 000 даляраў за 1 цэнт

Менавіта столькі аддаў прадпрымальнік з ЗША за манету, што была выпушчана ў Дэнверы ў 1943 г. Асаблівасць у манеты адна: яна зроблена не з ацынкаванай сталі, а з бронзы. Атрымалася гэта памылкова — тады манеты вырабляліся выключна са сталі, бо медзь як асноўны складнік бронзы ішла на ваенныя патрэбы. Папярэдні гаспадар манеты чатыры гады не згаджаўся выстаўляць яе на аўкцыён, але доўгія і складаныя перамовы ўсё ж такі далі вынік.

Атрыманыя за манету грошы пойдуць на дабрачыннасць.

**upi.com**

ЛЮБОШЧЫ

## Чаму мужчыны любяць даўганогіх жанчын?

**І жанчыны таксама часцей прыпыняюць погляд на даўганогіх мужчынах.**

Да такіх высноў прыйшлі польскія навукоўцы з універсітэта Вроцлава. Яны правялі эксперымент, падчас якога дзвесце з лішнім добраахвотнікаў абодвух палоў павінны былі ацаніць прывабнасць людзей процілеглага полу.

Некаторыя з фота былі калажнымі: ногі людзей на іх сталі даўжэйшымі за сярэдні паказчык у Польшчы на 5%, 10% ці нават 15%. Зразумела, добраахвотнікі пра лічбавую апрацоўку не ведалі.

Больш за ўсё добраахвотнікам абодвух палоў спадабаліся тыя людзі, у якіх ногі былі даўжэйшымі за стандартны паказчык па краіне на 5%.

За імі па ўзроўні прывабнасці ішлі людзі, чые ногі былі сярэдняй даўжыні, а трэцяе месца дасталася фатаграфіям, ногі людзей на якіх перавышалі стандартны паказчык на 10%.

Навукоўцы лічаць гэта нармальным: чалавечая свядомасць вызначае як найбольш прывабных тых патэнцыйных партнёраў, якія з'яўляюцца самымі здаровымі. Бо ўжо даказана, што ва ўладальнікаў кароткіх ног часцей, чым



у іншых людзей, развіваюцца дыябет і сардэчна-сасудзістыя захворванні. Таксама з'яўляецца фактам, што ў карotканогіх людзей больш высокі ўзровень трыгліцэрыдаў, якія правакуюць інсульты і артэрыяльныя захворванні.

Акрамя таго, доўгія ногі, і асабліва ў прадстаўніц прыгожага полу, — гэта прыкмета добрага харчавання ў дзяцінстве, бо ногі ў жанчын перастаюць расці, калі дзяўчына ўступае ў полавую спеласць. У мужчын, праўда, ногі растуць і пасля.

**mosmedclinic.ru**

НАЙЛЕПШЫ ПА ПРАФЕСІІ

## Гамяльчук за тры хвіліны з'еў 19 сасісак

Дзяржаўнае аб'яднанне «Гомельмясамалпрам» арганізавала абласны фестываль «Мяса-малочная краіна — 2010». Мерапрыемства праводзілася на плошчы Паўстання ў Гомелі.

Падчас фестывалю адбылося некалькі забаўляльных конкурсаў. Гамяльчанам было прапанавана на хуткасць есці сасіскі, піць малако і кефір. Паводле ўмоў «сасісачнага» конкурсу, удзельнікі павінны былі за тры хвіліны з'есці 30 вараных сасісак. З васьмі ўдзельнікаў зрабіць гэта не ўдалося нікому, таму пераможцам стаў той, хто з'еў найбольш сасісак. Выйграў конкурс гамяльчук, які з'еў 19. Ён атрымаў ва ўзнагароду некалькі колцаў сасісак. За конкурсам назіраў старшыня гарвыканкама.

Згодна з умовамі конкурсу «Малочныя вусы», літр кефіру трэба было выпіць з гладыша за хвіліну. Малады мужчына выканаў заданне датэрмінова і быў узнагароджаны наборам малочных тавараў. Яшчэ адзін конкурс прадугледжваў піццё малака з дзіцячай бутэлечкі з соскай. Пераможца таксама атрымаў пакет з малочнай прадукцыяй.

**БелаПАН**




## КАНЦЭРТЫ

### «Крама» ў «Графіці»

**8 кастрычніка ў клубе «Графіці» (зав.Калініна, 16)** — канцэрт «Крамы». **Пачатак а 19-й.**

### «Князь Мышкін» & Дзмітры Строцаў

**11 кастрычніка ў клубе «Лісіная нара» (вул. Каліноўскага, 32)** — «Князь Мышкін» і Дзмітры Строцаў. **Пачатак а 19-й.**

### «Без білета» ў Вільні

**9 кастрычніка ў віленскім «Mulen Ruzas» (V. M. Putino g. 5)** — першы віленскі канцэрт гурта «Без білета». **Пачатак у 19.00.**

## ІМПРЭЗЫ

### Бабіна лета ў Белаазёрску. Памяці Ніны Мацяш

**6 кастрычніка (серада) у Белаазёрску (Брэсцкая вобласць)** пройдуць паэтычныя чытанні «Бабіна лета ў Белаазёрску разам з Нінай Мацяш». **А 12-й** — ускладанне кветак да магілы Ніны Мацяш, наведванне кватэры, дзе жыла пісьменніца. **Чытанні пачнуцца а 15-й у Доме культуры.**

### Прыехаў «Дзядзька слэму»

**6 кастрычніка а 18-й у Музеі гісторыі беларускай літаратуры (вул.Багдановіча, 15)** пройдзе сустрэча з Маркам Смітам. Сміт праславіўся тым, што прыдумаў і ўвёў у шырокі ўжытак новую форму прэзентацыі паэзіі, слэм, падчас якога паэты не проста чытаюць свае творы, але і змагаюцца адно з адным за глядацкія сімпатыі. Адрозненні паміж амерыканскім і беларускім слэмам, паміж слэм-паэзіяй і паэзіяй звычайнай будуць прадэманстраваныя ў часе выступаў Віталя Рыжкова, Паўла Свярдлова, Веры і Віктара Жыбуляў. Мадэратар дыскусіі — Андрэй Хадановіч. А **8 кастрычніка а 19-й у мінскім R-club'е** пройдзе фінал англамоўнага паэтычнага слэму.

### Лявон Вольскі ў Лондане

Сустрэча адбудзецца **9 кастрычніка ў Беларускім доме (52 Penn Road, N7 9RE)**, які належыць Згуртаванню беларусаў у



Вялікабрытаніі. Падчас імпрэзы лідар N.R.M і «Крамбамбулі» будзе адказваць на пытанні гледачоў, спяваць песні і чытаць вершы.

### «Верасень» у электрычнасці

**13 кастрычніка ў фальварку «Добрыя мыслі» (вул. Магілёўская, 12) а 19-й** — новая праграма Вольгі Акуліч і гурта «Верасень» «у электрычнасці». Апроч музычнай часткі, наведнікаў фальварка «Добрыя мыслі» чакае і кінасюрпрыз — паказ кароткаметражных фільмаў Аляксея Марозава і Фёдара Немцава.

## ВЫСТАВЫ

### Фатограф свайго часу

**У Гістарычным музеі (вул. Маркса, 12) да 31 кастрычніка** працуе выстава «Фатограф свайго часу», прысвечаная 120-годдзю з дня нараджэння беларускага фотамайстра Ісака Салавейчыка. На выставе будуць прадстаўленыя арыгіналы і копіі фатаграфічных работ Ісака Салавейчыка — патрэты дзеячаў беларускай навукі і культуры, — створаныя ў перыяд 1952—1960 гг. падчас ягонай працы ў газеце «Літаратура і Мастацтва» і Дзяржаўным мастацкім музеі БССР.

### Выцінанкі Вячаслава Дубінкі

**Ад 6 да 24 кастрычніка ў музеі Максіма Багдановіча (вул. Багдановіча, 7а)** працуе выстава выцінанак Вячаслава Дубінкі «Я проста ў далёкай вандроўцы...», прысвечаная памяці знакамітага майстра. Выцінанкі Вячаслава Дубінкі шмат разоў экспанаваліся ў Беларусі і за мяжой, імі не раз ілюстраваліся кнігі. На іх аснове рэжысёр-мультыплікатар Міхась Тумеля здымае цыкл фільмаў «Беларускія прымаўкі».

### Выстава габеленаў

**Да 8 кастрычніка ў «Палацы Мастацтва»** працуе выстава «Габелены галерэі «Zacisze». Натхненнем для ткацкай творчасці з'яўляюцца творы мастакоў. Габелены могуць быць копіяй карціны, а часам толькі колеру. Або настрой карціны з'яўляецца асновай задумы для стварэння габелена.

### Джаз

**У мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» (Кастрычніцкая пл., 1) да 2 лістапада** працуе выстава габеленаў Марыі Барысенка «Джаз». Прадстаўленая серыя габеленаў — гэта спроба мастака знайсці пластычнае выражэнне музыкі і эмоцый, якія ўзнікаюць пад яе ўздзеяннем.

### Тэхна-арт. Знак якасці

**У мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» да 25 кастрычніка** працуе выстава «Тэхна-арт. Знак якасці», на якой прадстаўлена тэхна-мастацтва выдатнай якасці: камп'ютарная анімацыя, лічбавае фота і мантаж…

### Аксамітны трусік

Гістарычны музей прапануе ўсім ахвотным узяць удзел у выставе «Аксамітны трусік», якая адбудзецца **з 26 кастрычніка да 12 лістапада ў Доме-музеі I з'езда РСДРП**. Калі Вы самі робіце цацкі для дзяцей, падзяліцеся сваімі творамі з музеем на час правядзення выставы. Ад Вас чакаюць цацак з самых розных матэрыялаў: гліны і салёнага цеста, дрэва і тканіны… Усе цацкі будуць вернутыя гаспадарам па заканчэнні выставы. Заяўкі на ўдзел можна даслаць да 18 кастрычніка на адрас kassiana@tut.by. У заяўцы трэба пазначыць назву выставы, прозвішча і імя, пашпартныя дадзеныя, тэлефон.

### Карані

**У галерэі «Палац мастацтва»** працуе персанальная выстава Аляксандра Кошалева «Карані», прымеркаваная да 50-годдзя мастака. Закінутыя сядзібы, палескія прасторы, красаванне садоў, гудзенне пчол — усё гэта тэмы ягоных прац. Серыя прац прысвечана мясцінам, звязаным з жыццём М.Агінскага, Я.Чачота...

### Караткевіч у Кіеве

**Да 25 кастрычніка ў Нацыянальным музеі літаратуры Украіны (Кіеў)** працуе літаратурна-мастацкая выстава «Уладзімір Караткевіч. Быў. Ёсць. Буду», прымеркаваная да Дзён культуры Беларусі ва Украіне. На выставе прадстаўлены фотаздымкі, дакументы, асабістыя рэчы пісьменніка, кнігі з ягонай бібліятэкі, у тым ліку на замежных мовах (нямецкай, французскай, украінскай), мастацкія работы П.Драчова і Е.Ганкіна, прысвечаныя Уладзіміру Караткевічу.

## ТЭАТРЫ

### 6 кастрычніка

**Тэатр імя Горкага** — «Пане Каханку»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Раман + Юлія»
**Тэатр лялек** — «Драй швэстэрн» (для дарослых)
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Зіма»
**Тэатр оперы і балета** — «Іаланта»

### 7 кастрычніка

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Адамавы жарты»
**Тэатр оперы і балета** — «Кармэн»
**Тэатр імя Горкага** — «Эсфір»

### 8 кастрычніка

**Тэатр імя Горкага** — «Уяўны хворы»
**Тэатр оперы і балета** — гастролі тэатра балета Барыса Эйфмана: «Анна Карэніна»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Чайка»

### 9 кастрычніка

**Тэатр юнага гледача** — «Прыгоды Бібігона»
**Тэатр лялек** — «Чырвоны Каптурок»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Прыгоды маленькай ведзьмы»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Нязваны госць»
**Тэатр імя Горкага** — «Рускія вадэвілі»

### 10 кастрычніка

**Тэатр юнага гледача** — «Дзюймовачка»
**Тэатр лялек** — «Чырвоны Каптурок»
**Купалаўскі тэатр** — «Вячэра з прыдуркам»
**Тэатр імя Горкага** — «Праўда — добра, а шчасце лепш»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Адэль»
**Тэатр оперы і балета** — гастролі балета Барыса Эйфмана: «Чайка»

### 11 кастрычніка

**Купалаўскі тэатр** — «Я не пакіну цябе»

### 12 кастрычніка

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Хто пакахае мадам?»
**Тэатр юнага гледача** — «Апошняя дуэль»
**Тэатр оперы і балета** — «Баль-маскарад»
**Тэатр імя Горкага** — «Сыходзіў муж ад жонкі»

### 13 кастрычніка

**Тэатр оперы і балета** — «Жызэль»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Вандроўнікі ў Нью-Ёрку»
**Тэатр імя Горкага** — «Жаніхі»
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Старамодная камедыя»

### 14 кастрычніка

**Тэатр лялек** — «Піпі-Доўгаяпанчоха»
**Тэатр імя Горкага** — «Васа»
**Тэатр оперы і балета** — «Рыгалета»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Вяртанне галадара»
**Тэатр оперы і балета** — «Жызэль»

### 15 кастрычніка

**Тэатр оперы і балета** — «Жызэль»
**Тэатр імя Горкага** — «Дзева і смерць»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Адвечная песня»
**Тэатр лялек** — «Гісторыя аднаго горада»

### 16 кастрычніка

**Тэатр лялек** — «Чароўная лямпа Аладзіна»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Воўк-мараплавец»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Містэр Розыгрыш»
**Тэатр імя Горкага** — «Валянцінаў дзень»
**Тэатр оперы і балета** — «Чароўная флейта»

### 17 кастрычніка

**Тэатр лялек** — «Мыйдадзір»
**Тэатр оперы і балета** — «Тры парсючкі»
**Тэатр оперы і балета** — «Багема»
**Купалаўскі тэатр** — «Вячэра з прыдуркам»
**Тэатр імя Горкага** — «Даходнае месца»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Чорны квадрат»

## КІНО

### Тайны фінансавага крызісу ад Олівера Стоўна

**Уол-стрыт-2: Грошы не спяць**
(Wall Street: Money Never Sleeps)
ЗША, 2010, каляровы, 127 хв.
**Рэжысёр:** Олівер Стоўн
**Ролі выконваюць:** Майкл Дуглас, Шая Лабеф, Джош Бролін, Олівер Стоўн
**Жанр:** Фінансава-псіхалагічная драма
**Адзнака:** 6 (з 10)




Малады брокер Джэйкаб закаханы ў дачку фінансавага махінатара Гордана Гека, які нядаўна выйшаў з турмы. Дачка не жадае мець з бацькам нічога супольнага. Джэйкаб, які захапляецца талентамі Гека, вырашае памірыць сваякоў і павучыцца ў Гека брокерскаму майстэрству. Але набліжаецца фінансавы крызіс.

Амаль чвэрць стагоддзя таму Олівер Стоўн зрабіў выкрывальніцкі фільм «Уол-стрыт» пра норавы акулаў капіталізму. Але рэжысёр з прыкрасцю даведаўся, што галоўны адмоўны герой, бліскуча сыграны Майклам Дугласам, стаўся ўзорам для сучасных брокераў. Стоўн вырашыў ізноў разабрацца з клятым Горданам — тым болей, што распачаўся сусветны крызіс.

Сённяшняя стужка — ужо не лявацка-ікластая, як папярэдніца. Рэжысёр стрыманейшы і мудрэйшы: дастаецца ўсім. Стоўн паказвае, як фінансавыя бурбалкі сілкуюцца масавымі маніямі. Аўтар па-майстэрску ператварае нудныя лічбы ў чалавечыя драмы. І хаця гэта не самы відовішчны фільм у кар'еры рэжысёра, стужку варта паглядзець дзеля Сьюзан Сарандан — у ролі «фінансавай наркаманкі», якая падсела на крэдыты.

**Андрэй Расінскі**

# Топ самых крэатыўных беларускіх таварных знакаў

З кожным годам у Беларусі з'яўляецца ўсё больш новых брэндаў. Яшчэ большая колькасць арыгінальных задумаў у выглядзе таварных знакаў або марак складуецца да лепшых часоў у Нацыянальным цэнтры абароны інтэлектуальнай уласнасці.

Вывучэнне афіцыйных каталогаў таварных знакаў і знакаў абслугоўвання дазваляе зрабіць выснову, што самымі арыгінальнымі ў гэтым годзе былі прадстаўнікі дзвюх галінаў — кандытарскай і лікёрагарэлачнай.

СААТ «Камунарка» лёгка абыходзіць забарону на выкарыстанне савецкіх брэндаў, якая дзейнічае на расійскім рынку, «Мішуткам на паляне» (савецкі варыянт — «Мішка на паляне»). Нетрывіяльнай для кандытарскай прадукцыі здаецца і «спартакаўская» «Обучайка», а вось яшчэ адзін таварны знак — «Недаказанасць» — выклікае пытанні.

Арыгінальна гучаць яшчэ некалькі марак «Спартака»: «Папуасікі», «Оранжблю», «Арбуза-карапуза». Дзякуючы няхітрай гульні словаў, маркетолагі гомельскай фабрыкі нарадзілі і іншыя патэнцыйныя брэнды — «Шакапузікі», «Пупсікі», «Шакапупсікі».

З брэндаў «Чырвонага харчавіка» падкупляе лаканічнасцю і намёкам «Дзякую».

Фантазія гарэлачнікаў у нараджэнні новых таварных знакаў яшчэ больш неўтаймоўная. Хаця ёсць адна агульная тэма — вайна і перамога. У партфелі гродзенскага ЛВЗ «Неманофф», напрыклад, ёсць марка «Нармандыя-Нёман», у «Аквадыва» — «Аквадыў За Радзіму», у віцебскага завода «Прыдзвінне» — «За перамогу» і «Камбат», у мінскага «Крышталя» — «Франтавая». Уражвае неваенны таварны знак брэсцкага «Белалка» — «Чорны бос» (для экспарту ў Афрыку ці што?)

Ёсць у завода ў партфоліа і «Савеціка» (асобна — на лацінцы), «Сезам», а таксама «Моцны Арэшак». У мінскага «Крышталя» адзначым «Дыска», «Адзінства» і «Тры апельсіны».

Адразу на пэўную спажывецкую нішу замахваецца «Аквадыў Пралетарскі». У «Неманоффа» запамінаецца «Цешчын мёд», а віцебскі ЛВЗ, вядома, не змог абысціся без «Фестывальнай».

Самыя рамантычныя брэнды ў «Мінскхлебпрама»: «Магія кахання», «Жаданы», «Аксаміт ночы», «Іспанскі танец»... Вось толькі «Лясны пянёк» крыху выбіваецца з гэтай лінейкі. Параўнацца па рамантычнасці са сталічнымі хлебапёкамі могуць толькі гомельскія ювеліры, што замацавалі за сабой права на словазлучэнні «Разбудзіць багіню», «Прыгажосць адкрые ў табе багіню», «Я падарую табе райскае абуджэнне»...

«Людзі-знакі» — таксама даволі распаўсюджаная з'ява ў гэтай сферы. Шоўмэн Дзмітрый Урангель з'яўляецца трымальнікам двух варыянтаў — проста «Урангель» і Dr. Vrangel. Элегантны роспіс у золаце аднаго з найбагацейшых бізнэсоўцаў Беларусі Яўгена Шыгалава — таксама таварны знак.

Таварныя знакі з гістарычным напаўненнем асабліва папулярныя ў малочнікаў. Інстытут мясамалочнай прамысловасці з'яўляецца праваўладальнікам знака «Тызенгаўз», а Бярозаўскі сыраробны камбінат — «Радзівіл».

Змрачнаватым падаўся таварны знак «Рытуальнае» ад Беларускага народнага пенсійнага фонду (па класе 36 — страхаванне, фінансавая дзейнасць, крэдытна-грашовыя аперацыі і аперацыі з нерухомасцю). Ну а самай арыгінальнай эксперты палічылі «распрацоўку» ААТ «Абутак» — XODIKI.




**Кандыдат у пераможцы наступных гадоў — алей «Шалом».**

**zautra.by**

## Сапраўдная беларуская кухня

### Капуста квашаная па-камароўску

(атрымана ад гандлярак квашанай капустай на Камароўцы)

3 кг капусты, 1,5 л вады, 90 г (3 ст. лыжкі) буйной солі, морква і кмен да густу.

Нашаткаваць капусту, нацерці моркву. Перамяшаць капусту з морквай і кменам, не пераціраючы. Скласці ў пасудзіну, пасыпаць соллю. Заліць гарачай кіпячонай вадой. Прыцiснуць гнётам. Трымаць пасудзіну ў цёплым месцы трое сутак, кожны дзень 1—2 разы пратыкаючы, напрыклад, качалкай ці чыстай палкай, каб выходзілі газы. Потым раскласці ў слоікі і трымаць у лядоўні ці ў лёху.

Важна раскласці капусту па слоіках менавіта праз трое сутак, тады яна ўдасца выдатная па смаку і храбусткая.

**Наталка Бабіна**

ПРАДУКТ




## «Дзіцячы альбом» зрабіўся хітом

«За адзін дзень пасля выхаду распрадалі сто штук, што для Беларусі шмат, — кажа Зміцер Сідаровіч, адзін з прадусараў альбома. — Ідэя была выдаць не сто першы рок-альбом, а запоўніць лакуну дзіцячай музыкі». «Дзіцячы альбом» — гэта 27 народных песень, сярод якіх такія хіты, як «Цяцерка», «Ехаў мазур да млына», «Ладу-Ладкі», «Гэй, ты, воўчанька!». Часам — гэта аўтэнтычны вясковы гук, часам — набліжаныя да гарадскога гучання песні.

— Некаторыя песні з дыска, такія як «Верабей варыў піва», нагадваюць хутчэй раманс, чым народную мелодыю, — кажа музыка Таццяна Матафонава. — Таму мы вырашылі дадаць да традыцыйных народных інструментаў шасціструнную гітару. Ёсць і стылізацыі пад рок. Большасць песень прадстаўлена сучаснаму слухачу ў аўдыяварыянце ўпершыню.

«Дзіцячы альбом» каштуе ў незалежных распаўсюднікаў ад 12 да 17 тыс. рублёў. Яго можна пабачыць на сядзібах ТБМ (Румянцава, 13), БНФ (Машэрава, 8), на сайце knihi.by.

**ЛК**

НАСТРОЙ

## Перамагаем дэпрэсію за тры дні

«У мяне дэпрэсія!» — хто гэтай фразы не чуў або не прамаўляў. Найпапулярнейшая хвароба — гэта дэпрэсія. Асабліва цяпер — восенню, калі ўсе нервовыя рэакцыі абвастраюцца.

Пры гэтым далёка не ўсе ведаюць, што дэпрэсія — небяспечная хвароба, ад якой губляецца не толькі ўнутраны спакой, сон, але і працаздольнасць, а таксама развіваюцца псіхічныя захворванні.

### Сапраўдная і несапраўдная дэпрэсія

На сапраўдную дэпрэсію пакутуе 4 чалавекі са 100. Доўжыцца сапраўдная дэпрэсія гадамі, лечыцца выключна медыцынскімі сродкамі. А тое, ад чаго пакутуюць усе астатнія, — гэта хандра, сплін, стрэс, але ў народзе яно называецца дэпрэсіяй.

### Як змагацца?

«Вы хочаце пра гэта паразмаўляць?» — гэтая фраза лічыцца ключом для перамогі над дэпрэсіяй. Трэба толькі ўсё камусьці расказаць і ненадоўга стане лягчэй. Таму «ратаўнічыя» размовы нельга выкарыстоўваць як адзіны сродак. Тым больш што ёсць шанец «падзяліцца» сваёй хандрой з суразмоўцам.

Калі ж вам усё-такі ўдасца знайсці прычыну вашай дэпрэсіі — трэба сесці і ў адзіноце разабрацца, ці не з'яўляецца гэтая нагода смешнай. Разабраліся? Цяпер трэба расслабіцца.

Адзінае, калі вас расслабляе алкаголь, то трэба пільна адсочваць яго колькасць. Нядрэнна змяніць абстаноўку — з'ехаць куды-небудзь на пару дзён, ці, калі часу ці грошай на ад'езд няма, зрабіць у кватэры перастаноўку: і фізічнай энергіі шмат скінеце, і абстаноўку хоць як, але зменіце.

Самы просты спосаб пазбавіцца ад хандры — не адмаўляць сабе пару дзён у садавіне. Напрыклад, дапамагаюць бананы — дзякуючы вялікаму ўтрыманню магнію, цытрусавыя (дзякуючы вітаміну С), кава і моцная, добрая гарбата — з-за кафеіну.

А ўвогуле, чым менш пра свой настрой думаеце, тым хутчэй ад яго пазбавіцеся. Арганізму і самому непрыемны гэты стан.

Падводзім вынік. Размова з добрым чалавекам і вячэра са шчодрай дозай садавіны ў пятніцу. Салодкі чай у тэрмасе з сабой і выезд на бабіну сядзібу ў суботу. Басейн і генеральная прыборка дома ў нядзелю. І свет вам усміхнецца.

**Юрась Ускоў**

ЧЫТВО

## Брытанскія зняволеныя будуць зарабляць 10 даляраў за гадзіну

Улады Вялікабрытаніі маюць намер «прымушаць зняволеных да працы» падчас адбыцця імі турэмнага пакарання. Пра гэта абвесціў міністр юстыцыі краіны Кен Кларк.

Згодна з нававядзеннем, асуджаныя будуць працаваць па 40 гадзін у тыдзень, і пятая частка іх заробку будзе накіравана пацярпелым ад здзейсненых імі злачынстваў. Сярод магчымых працаў называюць сартаванне смецця.

Заробак зняволеных складзе $10 за гадзіну.

**НБа**

## Кемікі



1) Што было заўтра, а будзе ўчора?

2) Якім грэбнем нельга прычасацца?

3) Ад чаго качка плавае?

**Сабрала Валянціна Карнялюк.**

**Адказы глядзі на старонцы 16.**

## Прыватныя абвесткі

### ВІТАННІ

**Ад усяго сэрца віншуем Алену Буйніцкую і яе мужа** з нараджэннем сына Альгерда! Зычым ім шчасця і здароўя. Сябры.

**Віншуем Дзяніса Мельянцова з 30-годдзем.** Зычым дажыць да 300-годдзя! А яшчэ зычым як найбарздзжэй абараніць доктарскую дысертацыю! Сябры.

**Дарагі Падзвіжнік-Творца Анатоль Антонавіч Шнэйдар!** З 80-годдзем Вас! Шчасця, здароўя, моцы Вам і Талачыну. Міхась.

**Дарагі Паэце-случак Яўген Гучок!** З 70-годдзем Вас! Шчасця, здароўя, плёну! Сябар.

**Найшаноўнейшы Краязнаўца Аляксей Шалахоўскі!** З юбілеем Вас! Неўтаймаванасці, адкрыццяў, шчасця і здароўя! Сябар.

**Паважанейшая Мастак з Пружанаў Марыя Кулецкая!** З юбілеем Вас! Натхнення і плёну, шчасця і здароўя! Сябар.

**Дарагі сябар Саюза беларускіх пісьменнікаў Алесь Корнеў!** З 75-годдзем Вас і выхадам у гэтым годзе двух Вашых паэтычных зборнікаў. Добры сябар.

### ЗАНЯТКІ

**Запрашаю на заняткі дзяцей, падлеткаў, моладзь.** У праграме: мастацкае выплятанне з саломы, маляваныя дываны, паперапластыка (выцінанка, бібулкарства), маляванне на шкле, тэкстыльны дызайн (праца з лямцам, тканне пасаў) і яшчэ шмат-шмат чаго цікавага. Заняткі бясплатныя. Т.: (029) 312-54-71. Валянціна Лойка.

### КНІГІ, МУЗЫКА

**Прадаецца з першага да апошняга нумароў** амерыканскі часопіс «Полацак». Пасля 18-й. Т.: 8-0163-44-01-01.

**Часопісы** «ARCHE» 3-2002, 1-2005, 5, 7/8-2006; «Тэксты» 2004, 2007 прадам. Т.: (029) 332-69-56. Святлана.

**Прадаю незалежніцкія газеты** перыяду 1988—1992 гг. («Навіны БНФ», «Свабода», «Студэнцкая думка» ды інш.) Т.: (033) 634-32-01.

**Прадаю кнігу** «Між берагамі» Н.Арсенневай з асабістым подпісам паэткі. Т.: (033) 634-32-01.

### ЖЫТЛО

**Валька і Міхась здымуць** кватэру. Т.: (029) 690-92-56.

**Здам пакой** студэнту. Ст. м «Усход». Т.: (029) 569-79-90.

**Мяняю** 1-пакаёвую кватэру (17/30 кв.м, 4 паверх) у цэнтры Віцебска на любое жытло ў Мінску, можна непрыватызаванае. Т.: (029) 947-62-63.

### ПРАЦА

**Навучаю выяўленчаму мастацтву**, рыхтую да паступлення ў мастацкія навучальныя ўстановы. Т.: (029) 306-33-17, (029) 551-32-36.

### ПАТРЭБА

**Спявачку з Баранавіч Галіну Ярашэвіч напаткала бяда.** Некалькі дзён таму, калі спадарыня Галіна знаходзілася ў Варшаве, у яе здарыўся інсульт, жанчына ўпала проста на вуліцы. Цяпер спявачка ляжыць у адной з бальніц Варшавы ў цяжкім стане. Транспартаваць яе ў Мінск лекары не дазволілі. Дзякуючы дапамозе сваякоў, а таксама асабістай дапамозе Іны Кулей, сын спявачкі Павал Зубік сабраў частку грошай, патрэбных на лячэнне, і накіраваўся да маці ў Варшаву. Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя звяртаецца да ўсіх неабыякавых людзей з просьбай дапамагчы сабраць грошы дзеля лекавання Галіны Ярашэвіч. Па пытаннях дапамогі звяртайцеся да Таццяны Малашчанкі, (029) 723-53-60.

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайта www.nn.by. Дык скарыстайцеся!



**30 гадоў таму, 4 кастрычніка 1980 года, у аўтамабільнай катастрофе на дарозе Мінск—Масква загінуў Пятро Машэраў. Гэта быў прызначаны Масквой кіраўнік Беларусі, пасада якога гучала як «першы сакратар Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі».**
**Машэраў быў папулярны ў Беларусі. Ён быў супрацьлегласцю адарванаму ад людзей, схільнаму да п'янства тагачаснаму маскоўскаму кіраўніцтву Кампартыі. Нягледзячы на крайнюю палітычную асцярожнасць, Машэраў ажыццявіў шэраг крокаў па ўмацаванні нацыянальнай ідэнтычнасці беларусаў. Беларуская літаратура карысталася вялізнай дзяржаўнай падтрымкай, у сталіцы паўсталі помнікі нацыянальным класікам, тэлебачанне і радыё працавалі на беларускай мове.**
**Пры гэтым эканамічная палітыка Машэрава была цалкам у рэчышчы патрабаванняў Масквы: Беларусь была цалкам убудавана ў савецкія гаспадарчыя ланцужкі.**
**Нарадзіўся Машэраў (сапраўднае прозвішча — Машэра, пазней яго русіфікавалі) у Сенненскім раёне Віцебшчыны. Партызаніў на поўначы Беларусі, на Расоншчыне. Даслужыўся да камандзіра брыгады, пасля ўзначальваў Вілейскі абкам камсамола. Пасля вайны кіраваў камсамольскімі і партыйнымі структурамі.**
**Загінуў Машэраў, калі ягоная «Чайка» каля паварота на Смалявіцкую птушкафабрыку ўрэзалася ў грузавік. Пасля аўтакатастрофы па Беларусі пранесліся чуткі пра тое, што яна была падстроеная з Масквы, аднак таго так і не ўдалося даказаць.**

## Анекдоты

* * *

— Аддаю перавагу фарбаваным бландзінкам, а не натуральным.

— Чаму так?

— Дык натуральную паспрабуй яшчэ зразумей, што ў яе ў галаве. А фарбаваная — гэта дэкларацыя аб намерах.

* * *

Проста на працоўным месцы ў заапарку арыштаваны вожык-карупцыянер. Аператыўнікі таксама канфіскавалі дакументы, па якіх на яго ўтрыманне штогод выдаткоўвалася 14 мільёнаў рублёў.

* * *

Лукашэнка 40 гадоў вадзіў народ за нос па пустыні.

* * *

З міліцэйскіх зводак. Учора на тэрыторыі дзіцячага садка №13 была затрыманая падазроная жанчына, якая падглядала за дзецьмі з-за кута і нервова паліла. У ходзе расследавання было высветлена, што гэта выхавацелька.

* * *

Калі вы чакаеце гасцей і раптам заўважылі на сваім пінжаку пляму, не засмучайцеся. Гэта проста выправіць. Напрыклад, плямы ад алею лёгка выводзяцца бензінам. Плямы ад бензіну здымаюцца растворам шчолаку. Плямы ад шчолаку — воцатнай эсенцыяй. Сляды ад воцатнай эсенцыі — алеем. Ну а як выводзіць плямы ад алею, вы ўжо ведаеце.



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Запас бульбы.**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Такія калекцыйныя мадэлі выпускае Мінскі гадзіннікавы завод.**



**Упершыню карэйскі дыктатар Кім Чэн Ір (справа) паказаў СМІ свайго меркаванага пераемніка. 27-гадовы Кім Чэн Ын — на фота злева. Ён падобны да дзеда — Кім Ір Сена.**





**У такіх капсулах збіраюцца падымаць на паверхню зямлі шахцёраў, якіх 5 жніўня заваліла на чылійскай шахце «Сан-Эстэбан». 33 чалавекі чакаюць паратунку на 700-метровай глыбіні. Дастаць іх змогуць у лістападзе, пакуль перадаюць ежу.**

## «НН» сто гадоў з вамі

**Дзвінск.** На Дзвіне рачныя разбойнікі напалі ўночы на ганкі (плыты). Паміж разбойнікамі і асначамі (плытнікамі) пачалася бойка. Аднаго з асначоў ударылі вяслом, і ён памёр на месцы.

**«НН». № 38. 1910.**

**У кандыдатаў проста не модна** выглядаць інтэлігентнымі, разумнымі, забяспечанымі людзьмі. Вольна ці мімавольна яны капіююць стыль Лукашэнкі — папулісцкую трасянку пад лозунгам «Мы універсітэтаў не канчалі». Адзін кандыдат дэманструе фотку: «Я з сям'ёй на фоне роднага дома». «Родным домам» называецца стандартны шэры дзевяціпавярховік. Верагодна, «родны дом» кандыдата — гэта клятуха дзе-небудзь на сёмым паверсе, пятае акно справа, паміж смеццеправодам і зламаным ліфтам. У што будзе ператвараць родную краіну палітык з такімі ўяўленнямі пра «родны дом»?

**«НН». №41. 2000.**

**Адказы да старонкі 15:**
1) Сёння. 2) Грэбнем пеўня. 3) Ад берага.

**Наша Ніва**
незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Генадзевіч Скурко
заснавальнік — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА.** Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15–128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

**Наклад 6410.** **Газета выдаецца 48 разоў на год.**
Нумар падпісаны ў друк 23.00 05.10.2010.
Замова № 4852.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15–128.
Цана дамоўная.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
ISSN 1819-1614
9 771819 161008 10037